

KRUGH
№ 5
09.1996

БЕЛАРУСКАЯ ПРАВААБАРОНЧАЯ ГАЗЕТА
БЕЛОРУССКАЯ ПРАВОЗАЩИТНАЯ ГАЗЕТА
BELARUSIAN HUMAN RIGHTS NEWSPAPER

РЭФЕРЭНДУМ

НЕ МЯНЯЙЦЕ КАНСТЫТУЦЫЮ на ДЫКТАТУРУ

ДВА ГАДЫ НАЗАД МЕЧЫСЛАЎ ГРЫБ НА ПАСАДЗЕ СТАРШЫНІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА ПАДПІСАЎ КАНСТЫТУЦЫЮ НЕЗАЛЕЖНАЙ БЕЛАРУСІ. СЁННЯ НАС НАСТОЙЛІВА, БЕССАРОМНА КЛІЧУЦЬ ТУЮ КАНСТЫТУЦЫЮ ПАМЯНЯЦЬ НА НОВУЮ (ПРАЕКТ ЯЕ НАРЭШЦЕ АПУБЛІКАВАНЫ).

--Мечыслаў Іванавіч, нядаўна давялося прысутнічаць на прэс-канферэнцыі, якую давалі распрацоўшчыкі праекта новай Канстытуцыі -- дактары юрыдычных навук Віктар Шабайлаў і Анатоль Цікавенка. Яны сказалі, што сённяшняя Канстытуцыя не адпавядае сучаснаму стану грамадства. Наколькі Канстытуцыя "састарэла" за два гады?

--Гэта ўсё падыходы надуманыя. Віктар Іванавіч Шабайлаў быў адным з распрацоўшчыкаў Канстытуцыі 1994 года, ён мог рабіць прапановы. Але тады ён не быў на службе ў Прэзідэнта і таму меў іншыя погляды. Нельга зараз сказаць, што Канстытуцыя дасканальная. Як і ўсякі дакумент, яна можа ўдакладняцца. Але, я лічу, Канстытуцыя атрымалася добрая.

Заканчэнне на стар. 2

"КРУГЛЫЙ СТОЛ"

СОГЛАШЕНИЕ

УЧАСТНИКОВ "КРУГЛОГО СТОЛА", ПРЕДСТАВЛЕННЫХ РУКОВОДИТЕЛЯМИ ОРГАНОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ ВЛАСТИ, ВЕДУЩИХ ПОЛИТИЧЕСКИХ ПАРТИЙ, ДВИЖЕНИЙ, ПРОФЕССИОНАЛЬНЫХ СОЮЗОВ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Мы, участники "круглого стола", с полной ответственностью констатируем, что наша республика переживает глубокий экономический и политический кризис. Перспектива выхода из него видится в создании гражданского общества.

Принимая во внимание обострение социально-экономической ситуации и нарастание политического противостояния, угрожающие гражданскому миру и стабильности общества, разделяя гражданскую ответственность за судьбу государства и народа, основываясь на Конституции, Законах, признании существующих институтов власти, участники "круглого стола" берут на себя следующие обязательства:

1. Всю свою деятельность осуществлять исключительно в рамках Конституции, Законов.

2. Гарантировать соблюдение прав и свобод человека в Республике Беларусь.

3. Привести в соответствие с Конституцией Республики Беларусь все Законы, подзаконные акты и решения, признанные Конституционным судом не соответствующими Конституции и ныне действующим Законам.

4. Неукоснительно выполнять Закон о СМИ, гарантировать их свободу, создать Наблюдательный общественный совет при Национальной телерадиокомпании.

5. В рамках существующего законодательства обеспечить полную гласность в деятельности президента, Верховного Совета, Кабинета Министров Республики Беларусь.

6. Добиться проведения выборов в Верховный и местные Советы в срок, назначенный Центральной комиссией по выборам и проведению республиканских референдумов.

Участники "круглого стола" призывают все государственные институты, политические силы, общественные организации, трудовые коллективы, граждан Беларуси поддержать это Соглашение и действовать в соответствии с ним.

Участники данной встречи объявляют свой "стол" постоянно действующим, полагая главной его целью защиту Конституции Республики Беларусь. Они приглашают к участию в "круглом столе" всех, кто желает политической стабильности, социального мира и преодоления экономических трудностей.

Всего 21 подпись

Минск, 21 августа 1996г

УЛЬТИМАТУМ ПРЕЗИДЕНТУ

28 августа 1996 года участники "круглого стола" распространили новое заявление, в котором призывают Верховный Совет назначить референдум, альтернативный президентскому. Текст заявления носит характер ультиматума:

"При отказе президента до 15 сентября с.г. отменить свои неконституционные указы, противодействии конституционному праву народа доизбрать своих представителей в Верховный Совет и местные советы или проведении референдума по социальнозначимым вопросам общественно-политической жизни Республики Беларусь и любых других нарушениях закона участники "круглого стола" обратятся к Верховному Совету с призывом начать процедуру отстранения от должности (импичмента) президента Республики Беларусь А. Лукашенко и готовы взять на себя ответственность за действия своих представителей в парламенте в поддержку этой акции."

КРУГ ВАШЕЙ ЖИЗНИ. ЭТО – СЕРЬЕЗНО.

ЧИТАЙТЕ "КРУГ" ВЕСЬ МЕСЯЦ:

Мечыслаў ГРЫБ:

НЕ МЯНЯЙЦЕ КАНСТЫТУЦЫЮ на ДЫКТАТУРУ

Заканчэнне. Пачатак на стар. 1

Калі б ужо ўдакладняць Канстытуцыю, то ўдакладняць у другім сэнсе – напрыклад, у артыкуле 19 трэба было б запісаць, што сімволіка рэспублікі Беларусь – Герб, Сцяг і Гімн – зацвярджаецца законам. Далей, на мой погляд, трэба было даць магчымасць работнікам Пракуратуры, каб яны маглі праводзіць вышэйшы кантроль за выкананнем законаў як выканаўчай, так і заканадаўчай уладай -- і Вярхоўным Саветам, і Кабінетам міністраў, і адміністрацыяй Прэзідэнта. Трэба было яшчэ тады выкрэсліць з праекта Канстытуцыі тое, што ў нашай краіне могуць ствараццa нейкія пазабюджэтныя фонды. Гэта – злоўжыванне ўладай: што за фонды, адкуль яны бяруцца? Грошы ідуць туды міма бюджэта, і атрымліваецца, што адзін вельмі багаты, а другі бедны. Я таксама прапанаваў бы на сённяшні розум увесці ў Вярхоўным Савеце казначэйства, якое кантралявала б выкананне бюджэта ад пачатку да канца. А не тое, што сёння – Вярхоўны Савет прыняў, і мінфін робіць справаздачу праз шэсць месяцаў.

--Распрацоўшчыкі казалі аб тым, што ў сённяшнім выглядзе Канстытуцыя не дае магчымасці праводзіць рынкавыя рэформы...

--Хто мне скажа, каму, якой часткай артыкулаў Канстытуцыя перашкаджае праводзіць рынкавыя рэформы? Я чытаў сотні разоў гэтую Канстытуцыю і не знаходжу там такіх артыкулаў. Усе формы ўласнасці маюць аднолькавыя правы па абароне, гэта і патрабуе замацавання ў Канстытуцыі.

Проста ўлада не ведае, як праводзіць гэтыя рэформы, з чаго іх пачынаць. Мы пачалі праводзіць рэформы яшчэ да выбрання Прэзідэнта, але зараз рэформы тармозяцца. Прэзідэнт ніяк не можа вырашыць, што рабіць з буйнымі прадпрыемствамі, кажучы, што не аддасць іх, не дазволіць драбіць, а як жа па-іншаму зрабіць, каб прадпрыемства працавала? Складанае пытанне, але было даволі часу, каб яго вырашыць і без змен у Канстытуцыі.

Нарматыўнай базы для рэформаў дастаткова, але калі выканаўчай уладзе яе мала -- чаму яна не падае прапаноў? Калі патрэбны табе гэты закон, каб працавалі прадпрыемствы – унось прапановы, каб ты потым ні за кога не хаваўся. У Францыі ні адзін закон не прымаецца, калі ён не распрацаваны выканаўчай уладай.

--У праекце Канстытуцыі прапануецца новая сістэма ўлады – двухпалатны парламент. Як гэта стасуецца з тым, што наша дзяржава ўнітарная?

--Прэзідэнт кажа, што нам не трэба 260 дэпутатаў, хопіць і 50. Але справа не ў тым, колькі нам патрэбна дэпутатаў. А ў тым, што сёння толькі з Мінска больш 20 дэпутатаў не прадстаўлена, а ўвогуле 61 дэпутат не прадстаўлены ў парламенце. Калі прыкладна браць, каля двух мільёнаў выбаршчыкаў не маюць сваіх прадстаўнікоў у Вярхоўным Савеце.

Наогул, двухпалатны Вярхоўны Савет – гэта прыцягнута за вушы. У нас унітарная дзяржава, невялікая. Калі стварыць сенат і палату прадстаўнікоў, Вярхоўны Савет нічога не зможа зрабіць. Анічога. Прэзідэнту не трэба будзе і ўступаць у кантакты з гэтым парламентам, сварыцца за нешта, за яго ўсё гэта будзе рабіць сенат, людзі, якія ім прызначаны на гэтыя пасады. Туды прызначаю, у "вертыкаль", потым сюды прызначаю, у сенат. Дрэнна сябе паводзіш – я цябе адусюль здымаю.

Вялікая мара Прэзідэнта – каб Вярхоўны Савет быў не пастаянна дзеючым, а каб збіраўся два разы ў год і зацвярджаў яго ўказы. Каб сустрэліся дэпутаты, папілі чаю, кавы ці яшчэ чаго -- і раз'ехаліся. На падставе новай Канстытуцыі ён гэтага даб'ецца. І застанецца кіраваць адзін.

--Ці добра, на ваш погляд, вызначаны ў Канстытуцыі кампетэнцыі Прэзідэнта і Вярхоўнага Савета? Там пазначана, што Прэзідэнт выдае ўказы ў межах сваёй кампетэнцыі, але кампетэнцыя не вызначана, што на сёння дае Прэзідэнту вялікае поле для "дзейнасці".

--Мы заўважылі гэта раней, яшчэ ў Вярхоўным Савеце дванаццатага склікання, і таму, каб не было гэтых супярэчнасцей, мы распрацавалі і прынялі тры законы – аб Вярхоўным Савеце, Прэзідэнце і Кабінеце міністраў, дзе паўнамоцтвы размеркаваны і ўсё зразумела. І нават міжнародныя юрысты нам выказвалі меркаванні, што гэта новы падыход, і ён заслугоўвае вялікай увагі.

Трэба было б больш дакладна сфармуляваць соты артыкул Канстытуцыі, але ж мы разлічвалі, што да ўлады прыйдзе нармальны чалавек, які будзе разумець гэты артыкул так, як трэба.

--Прынада, на якую абавязкова "клюне" выбаршчык, -- у новай Канстытуцыі пералічана больш сацыяльных правоў, ёсць нават права на ежу і вопратку...

--Калі мы прымалі Канстытуцыю, мы спрачаліся, ці замацаваць які-небудзь дзяржаўны лад у ёй. А потым, калі вывучылі шэраг канстытуцый іншых дзяржаў, прыйшлі да высновы, што гэта рабіць не трэба. Мы павінны даць правы і свабоды людзям працаваць і самім вырашаць свае пытанні. Канстытуцыя, сапраўды, дае толькі права, напрыклад, на жыллё, а не дэкларыруе абавязкова ўсім бясплатнае жыллё. "Абавязкова" запісаць і немагчыма. Калі будзе ўсё дзяржаўнае, калі вялікая частка заробленага чалавекам будзе пераразмяркоўвацца дзяржавай, -- тады іншая справа. Але я ўпэўнены, што сам чалавек намнога лепш вырашыць сваю жыллёвую праблему, чым калі за яго зробіць гэта дзяржава.

--Якія сацыяльныя гарантыі павінны быць у Канстытуцыі, а якія трэба аддаць на волю нармальна функцыяніруючай рынкавай эканомікі? Падобна, што пад сцягам "клопатаў аб народзе" у Канстытуцыю прыцягнуць і права на спорт, і на вышэйшую адукацыю, і на што хочаце... За гэта хто заўгодна пойдзе галасаваць на рэферэндум.

--Я думаю, што ў першую чаргу людзям трэба даць права на медыцыну, адукацыю і сацыяльную дапамогу ў старасці. Усё астатняе павінна вырашацца самім чалавекам – як ён будзе працаваць. Хай мне хто-небудзь дакажа, што ўсе людзі роўныя, што людзі роўнымі нараджаюцца. Людзі розныя – кожны па-свойму таленавіты, кожны па-свойму лянаваты, ці працавіты, што можа зрабіць адзін, не заўсёды можа зрабіць другі. Чаму здольны чалавек павінен атрымліваць толькі тое, што можа зарабіць менш здольны чалавек, чым ён?

А хто за сацыяльную абарону нашых людзей змагаўся і хто спрабаваў адняць у ветэранаў, сем'яў загінуўшых льготы, хто? Прэзідэнт адмяніў льготы сваім указам, а дэпутаты, у тым ліку і я, дайшлі да Канстытуцыйнага суда, і нешта ўдалося вярнуць назад. Але ж зараз гэта ніхто не памятае, і ветэраны гавораць "дзякуй" таму, хто ў іх калісьці ўсё адабраў, а цяпер частку вярнуў. Думаю, што нават калі людзі шляхам рэферэндуму "пашыраць" сваю сацыяльную абароненасць, сапраўдная сацыяльная абарона не ўзнікне з нічога ў бедным і неправавым грамадстве.

--Вяртаючыся да дактароў Шабайлава і Цікавенкі. Яны канстатавалі, што мы будуем усё ж такі рынкавую эканоміку, а ў Канстытуцыі 1994 года прыватная ўласнасць, быццам бы, не вельмі добра абаронена. Як у канстытуцыях іншых краін абаронена ўласнасць, ці дастаткова абараняе яе наша Канстытуцыя?

--Ва ўсіх канстытуцыях дэмакратычных дзяржаў уласнасць больш і лепш не абаронена, чым у нашай Канстытуцыі. Па Канстытуцыі, у нас кожная форма ўласнасці мае роўныя правы. Удасканаліць, пашырыць абарону ўласнасці, дэталізіраваць яе можна шляхам прыняцця адпаведных законаў. Але гэты артыкул аб роўнасці формаў уласнасці не выконваецца той жа выканаўчай уладай.

--Якое Ваша стаўленне да іншых пытанняў, вынесеных на рэферэндум?

--Пытанне аб свяце адразу выклікае заклапочанасць. Свята гэта – Дзень Незалежнасці, дзень суверэнітэта Рэспублікі Беларусь. Калі мы адмяняем гэта свята – мы ўскосна выходзім на адмену суверэнітэта і незалежнасці нашай краіны. Гэта як юрыст я разважаю.

А ўзяць пытанне ўласнасці на зямлю. Дзе, у якой краіне ёсць бескантрольны продаж зямлі? А пойдзем ад адваротнага – калі людзі падтрымаюць гэтае пытанне? Можна будзе прадаць Віцебскую вобласць? Возьмуць і прададуць, але гэта будзе парушэннем тэрытарыяльнай цэласнасці рэспублікі.

--Што Вы як распрацоўшчык Канстытуцыі параіце дэпутатам?

--Рэферэндум наогул не трэба праводзіць, гэта марнатраўства. Я прапанаваў бы таксама Вярхоўнаму Савету прыняць закон аб мараторыі на змены ў Канстытуцыю на два ці тры гады. Трэба ж зразумець, гэта Канстытуцыя ці іншая, якую Шабайлаў праз два гады напісаў, -- яна, зразумела, усе роўна не будзе ўсіх задавальняць. І няма такога закона, няма такой канстытуцыі, якія задавальнялі б усіх. Калі людзі пойдуць на рэферэндум, там будуць падробкі і падман. Буду ездзіць у сваю акругу і тлумачыць гэта выбаршчыкам.

--Як ставяцца да таго, што адбываецца, вашы выбаршчыкі?

--Ставяцца па-рознаму. Нехта падтрымлівае прэзідэнта, нехта не. Але відавочна змянілася адно – людзі пачалі баяцца выказваць сваю думку, асцерагаюцца. Зараз жа ўсё адсочваецца, з гэтага робяцца пэўныя вывады -- і вынікі.

--Ці чакалі Вы, што прынятая Канстытуцыя будзе так хутка пастаўлена пад сумненне?

--Цяжка сёння ўявіць, што чалавек, які абавязаны гэтай Канстытуцыі ўсім, што ён на сённяшні дзень мае, а на сённяшні дзень ён мае вельмі нямала, -- і пасаду, і ўладу, і царскія паўнамоцтвы, чалавек, які прыносіў прысягу на гэтай Канстытуцыі, кляўся, што ён ніколі не будзе парушаць гэтую Канстытуцыю і законы, які павінен шанаваць Канстытуцыю як сваю маці, і нават больш чым маці, таму што маці чалавек не выбірае, а за Канстытуцыю ён сам галасаваў і працаваў над ёй – першы замахнецца на яе. І гэта да добрага не прывядзе.

Той, хто сёння гэта робіць, нават не бачыць усіх наступстваў такіх крокаў. А наступствы могуць быць вельмі і вельмі непрадбачлівымі, яны могуць сёння нават і не праглядацца. Не будзе Вярхоўнага Савета – хто застанецца? Адзін! Уладар!

Вяла інтэрв'ю
Таццяна КАЛІНОЎСКАЯ

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

ДРУГІ ЎДАР

ЯКІМ БУДЗЕ НОВЫ РЭФЕРЭНДУМ? "НОВЫ", БО АДЗІН МЫ НЕ ТАК ДАЎНО ПЕРАЖЫЛІ. ВА ШТО ЁН ВЫЛЬЕЦЦА?

Для мяне асабіста -- і я думаю, не толькі для мяне, а і шмат для каго – ясна як Божы дзень: чым-чым, ды вышэйшай формай волевыяўлення народа новы рэферэндум не будзе, не будзе сапраўды дэмакратычнага, сапраўды свабоднага і свядомага (што адно і тое ж, па сутнасці) галасавання. Гэта несумненна. Гэта дакладна. Гэта можна сцвярджаць апрыёры.

Чаму так? Якія ёсць падставы для таго сцвярджэння?

Ну, па-першае, мы прайшлі праз адзін прэзідэнцкі так званы рэферэндум, ведаем, што гэта такое, помнім, як, якімі сіламі ён ініцыраваўся і горача падтрымліваўся, як праводзіўся, бачым наяве яго горкія плады і сумныя наступствы (мне прыходзілася пра ўсё гэта пісаць). А па-другое... Не паспеў Аляксандр Рыгоравіч запусціць у афіцыйны абарот сваё рашэнне, гэта значыць накіраваць у адрас Вярхоўнага Савета неабходныя дакументы (ліст з прапановай і праект пастановы "Аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндума ў Рэспубліцы Беларусь і мерах па яго забеспячэнню"), не паспелі ў Вярхоўным Савеце разгледзець як след, хаця б папярэдне, хаця б на ўзроўні сакратарыята і юрыдычнага аддзела, прысланыя ў аўральным парадку дакументы (а рашэнне аб правядзенні рэферэндума можа прыняць, згодна з існуючым заканадаўствам, толькі Вярхоўны Савет), а ўжо ўся "прэзідэнцкая раць", як "вертыкальная", так і "гарызантальная", прыступіла да чарговай – пасля "бітвы за ўраджай" – бітвы за рэферэндум.

Бітва ёсць бітва. Радзіма-маці і Прэзідэнт – бацька клічуць! Усё для фронта, усё для перамогі! Зычна прагучаў трубны сігнал фанфараў, загрымелі ўдары барабана... З рэзідэнцыі адміністрацыі кіраўніка дзяржавы пайшлі (прадаўжаюць ісці) ва ўсе куткі Беларусі, у аблвыканкамы і гарвыканкамы, адпаведныя, пісьмовыя і вусныя, адкрытыя і сакрэтныя дырэктывы. Згодна з імі ствараюцца штабы (бітва ёсць бітва!), фарміруюцца групы падтрымкі, інфармацыйныя і лектарскія групы, у выканкамах спешна арганізоўваюцца новыя, агітацыйна-прапагандысцкага профілю, упраўленні і аддзелы і ўводзяцца новыя штатныя адзінкі, ідзе збор інфармацыі пра людзей, якія не выклікаюць сумневу ў сэнсе іх "благонадежности", лаяльнасці ў дачыненні да рэжыму і могуць быць, такім чынам, дапушчаны да падрыхтоўкі і правядзення рэферэндума.

Але гэта яшчэ не ўсё. Бітва ёсць бітва. Усё для рэферэндума, усё для перамогі! (Каго над кім? Аднай часткі народа над другой?). З падачы вышэйшых уладаў і за кошт сродкаў, узятых у і без таго беднай дзяржаўнай казне, у Мінску склікаецца так званы Беларускі нацыянальны кангрэс – шматтысячнае прапагандысцкае шоу для падтрымкі ініцыятывы Прэзідэнта. Плануецца правядзенне – той жа сцэнарый, тая ж рэжысура – жаночага, маладзёжнага, ветэранскага і афіцэрскага з'ездаў.

Памяць падказвае: такую вось, такога маштаба і характара, псіхалагічную апрацоўку грамадскай свядомасці можна параўнаць толькі з адыёзнымі акцыямі самай масавай арганізацыі нацысцкага рэжыму – Працоўнага фронта, які ўзначальваў недалёкі, балбатлівы, але затое фанатычна адданы свайму фюрэру Лей.

А цяпер давайце перавядзем дыханне і памяркуем, зададзімся пытаннем: ці стасуюцца гэтыя вось "бітва за рэферэндум", гэтыя ўсе "меры" і "мерапрыемствы" з сапраўдным волевыяўленнем народа, з цывілізаваным, па-дзяржаўнаму адказным высвятленнем думкі грамадзян па надзённых пытаннях палітычнага і грамадскага жыцця? Ці лепшы спосаб раіцца з народам пад барабанны бой? Нешта не стасуецца тут, не вяжацца адно з другім. Або яшчэ давайце паставім пытанне так: "Ці можа адбыцца рэферэндум (сінонімы: плебісцыт, апытанне, усенароднае галасаванне) як нязмушанае, свабоднае волевыяўленне, як непадробная праява непасрэднай (прамой) дэмакратыі, непасрэднага народаўладдзя ва ўмовах такога вось татальнага "забеспячэння" – арганізацыйнага, інфармацыйнага, агітацыйна-прапагандысцкага, палітычнага?

Адказ напрошваецца сам сабой: не, не можа. Можа мець месца толькі палітычная фікцыя. Паказальны ў гэтым сэнсе наступны факт. Аўтары канфідэнцыяльна распрацаванай у нетрах прэзідэнцкай адміністрацыі і МЗС "Праграмы знешнепалітычнага забеспячэння рэферэндума" (пра яе паведамілі шмат якія газеты) прагаварыліся. "У складаўшыхся ўмовах, -- пішуць яны, -- лічым своечасова пачаць серыю грамадска-палітычных акцый па ўмацаванню законнай улады, у прыватнасці арганізацыі і правядзення рэферэндума". Так што, як бачым, рэферэндум з самага пачатку задумваўся не як жыццёва неабходны зварот да народа з добрым намерам высветліць яго думку, а толькі як адна з многіх грамадска-палітычных акцый, накіраваных на... умацаванне ўлады.

Падрыхтоўка рэферэндума пачалася не з пошуку ісціны, як гэта павінна было б быць па ідэі, а, наадварот, са скажэння ісціны. Ва ўсіх дзяржаўных сродках масавай інфармацыі з'явілася паведамленне галоўнага ўпраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі адміністрацыі Прэзідэнта пад кідкім загалоўкам "Рэферэндум вырашыць канстытуцыйны крызіс". У загалоўку адзначаеш адразу два ілжывых сцвярджэнні: першае – наконт канстытуцыйнага крызіса (адкуль ён раптам узяўся? Яшчэ учора літаральна пра яго нічога не гаварылася, нічога не было вядома?); другое – адносна таго, што канстытуцыйны крызіс можна вырашаць рэферэндумам. (Гэта ж – успомнілася вядомая карціна Рэпіна – не пісьмо турэцкаму султану пісаць.)

Чытаеш "паведамленне" далей: "Два гады, якія прайшлі пасля прыняцця сённяшняй Канстытуцыі, паказалі, што такая спешка і келейнасць, з якімі быў прыняты Асноўны Закон, у многім вызначылі яе буйныя недахопы і супярэчнасці". І далей: "Цяперашняя Канстытуцыя, якая закранае лёс кожнага грамадзяніна і дзяржаву ў цэлым, на ўсенароднае абмеркаванне не выносілася і была прынята толькі дэпутатамі Вярхоўнага Савета". Суцэльная, можна сказаць, "дэза".

Як былы дэпутат Вярхоўнага Савета дванаццатага склікання і член яго Канстытуцыйнай камісіі (працаваў у ёй з першага і да апошняга дня) даю даведку. Ніякай спешкі і ніякай келейнасці не было. Пастанова Вярхоўнага Савета "Аб выбранні Канстытуцыйнай камісіі" была прынята на першай сесіі 20 ліпеня 1990 года, а прынята канчаткова Канстытуцыя, як вядома, была толькі на трынаццатай сесіі 15 сакавіка 1994 года. Прымалася, як бачым, амаль чатыры гады.

У пастанове Вярхоўнага Савета ад 20 ліпеня 1990 года было запісана: "Канстытуцыйнай камісіі распрацаваць праект Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Рэспублікі Беларусь і ў 1991 годзе апублікаваць для народнага абмеркавання. Па завяршэнні народнага абмеркавання праекта Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Рэспублікі Беларусь унесці яго на разгляд сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь". У лістападзе 1991 года праект Асноўнага Закона быў папярэдне разгледжаны на восьмай сесіі Вярхоўнага Савета (умоўна гэта можна было назваць першым чытаннем) і рэкамендаваны для апублікавання ў сродках масавай інфармацыі для ўсенароднага абмеркавання.

Абмеркаванне дало свой плён. Былі выказаны заўвагі па 100 артыкулах са 171 (столькі іх было ў першым варыянце Канстытуцыйнай камісіі).

У жніўні 1992 года новы, дапрацаваны варыянт праекта Асноўнага Закона быў вынесены на народнае абмеркаванне паўторна. Тым жа шляхам – праз сродкі масавай інфармацыі. Напярэдадні прыняцця быў абнародаваны такім жа чынам і з той жа мэтай трэці варыянт праекта новай Канстытуцыі.

Як бачым, праект нашай Канстытуцыі выносіўся тройчы для абмеркавання яго грамадзянамі краіны. Пра якую, паўтараю, паспешлівасць можна ў такім разе гаварыць?

Што датычыць келейнасці, то мушу нагадаць і наступныя перыпетыі. У лютым 1991 года па ініцыятыве і пад эгідай Вярхоўнага Савета, у прыватнасці яго Канстытуцыйнай камісіі, і пры актыўным удзеле юрыдычнага факультэта БДУ была праведзена навукова-практычная канферэнцыя на тэму "Канцэпцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і фарміраванне прававых асноў грамадзянскай супольнасці і дзяржавы". Адбылася разгорнутая двухдзённая дыскусія, у якой прынялі ўдзел не толькі лепшыя юрысты – правазнаўцы Беларусі, але і іх калегі, спецыялісты ў галіне канстытуцыйнага права Расіі, Украіны і Узбекістана. Матэрыялы канферэнцыі, у прыватнасці тэзісы дакладаў (іх набралася больш за сто) былі потым сабраны ў двух тамах і распаўсюджаны.

Само сабой зразумела, што на ўсіх этапах сваёй дзейнасці Канстытуцыйная камісія, яе пастаянная рабочая група цесна супрацоўнічалі з усімі зацікаўленымі ведамствамі і ўстановамі, перадусім з юрыдычным упраўленнем Савета Міністраў, з Міністэрствам юстыцыі, з Вярхоўным судом і Пракуратурай Рэспублікі Беларусь. Праект прайшоў сур'ёзную міжнародную экспертызу, атрымаў станоўчы водгук аўтарытэтных правазнаўцаў Германіі, Расіі, ЗША.

Такая сапраўдная, а не фальсіфікаваная сітуацыя з прыняццем дзеючай Канстытуцыі.

З падачы Прэзідэнта дзяржаўныя СМІ тыражыруюць тэзіс наконт таго, што ў існуючай Канстытуцыі быццам бы адсутнічаюць гарантыі сацыяльных правоў грамадзян. Дзяшовы прапагандысцкі трук, разлічаны, зноў-такі, на прастакоў і на недасведчаных, на тых, хто незнаёмы з тэкстам Асноўнага Закона. Бо варта толькі разгарнуць яго, каб пераканацца, што ў Канстытуцыі ёсць раздзел II "Асоба, грамадства, дзяржава", які пачынаецца са слоў: "Забеспячэнне правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь з'яўляецца найвышэйшай мэтай дзяржавы". Побач з грамадзянскімі і палітычнымі правамі падрабязна выкладзены правы сацыяльныя: права – на адпачынак (артыкул 41), на ахову здароўя, у тым ліку на бясплатнае лячэнне (артыкул 43), на жыллё (артыкул 48), на адукацыю (артыкул 49) і г.д.

Выходзіць, мае рацыю журналістка Ірына Халіп, якая зазначыла ў газеце "Імя" у адрас ініцыятараў рэферэндума: "Дрэнна забытае старое, або як яны робяць з нас ідыётаў".

Не маюць пад сабой сур'ёзнай падставы і сцвярджэнні, што "Канстытуцыя, па сутнасці, пазбаўляе Прэзідэнта ўсіх рычагоў кіравання", што "Канстытуцыйны суд ператварыўся ў прыдатак заканадаўчага органа, у прыладу ціску на кіраўніка дзяржавы і выканаўчую ўладу", што перанос галоўнага свята з 27 на 3 ліпеня патрэбны для таго, каб "не напаляць страсці, не параджаць канфрантацыю і напружанасць у грамадстве" і што, нарэшце, кіраўніцтва "мае рэальную праграму ператварэння Беларусі ў дзяржаву сапраўднага народаўладдзя". Як едка заўважыў Марк Твэн, "што няпраўда, то мана, і тут ужо нічога не зробіш".

Імем ранейшага рэферэндума была пастаўлена пад сумненне незалежнасць Беларусі як дзяржавы, як паўнавартаснага суб'екта міжнароднага права (пытанне аб інтэграцыі), быў пастаўлены пад удар статус беларускай мовы як дзяржаўнай, зліквідаваны нашы сапраўдныя сімвалы. Імем другога рэферэндума будуць разбураны, па сутнасці, такія атрыбуты дзяржаўнасці, як Канстытуцыя, Канстытуцыйны суд, інстытут заканадаўчай улады. Што ад нас як рэспублікі, як дзяржавы застанецца?

Задумайцеся, шаноўныя грамадзяне, над гэтымі пытаннямі. І калі вы ўсё ж дазволіце ўцягнуць сябе ў навязаную вам гульню ў рэферэндум, то прыгадайце, ідучы на выбарчыя ўчасткі, радкі, якія Янка Купала напісаў у 1918 годзе, калі ў беларусаў з'явілася надзея "заняць свой пачэсны пасад між народамі". Вось яны, гэтыя адрасаваныя нам, сённяшнім, радкі:

Час склікаці
ўжо грамаду
На вялікую нараду,
На вялікі сход!
Хай рассудзіць,
хай разважа,
Слова цвёрдае
хай скажа,
Скажа сам народ!
Як жыць мае, пажываці
Ў родным краі,
ў роднай хаце,
Як заводзіць лад:
Ці жыць далей у няволі,
Ці разжыцца
новай доляй,
Новы ўзнесць пасад.

ЗРУШЭННЕ АКЦЭНТАЎ

Карлас ШЭРМАН

ТАК ЯНО НА ПРАКТЫЦЫ ПАВЯЛОСЯ Ў САМЫХ РОЗНЫХ КРАІНАХ СВЕТУ, -- ВУСНЫЯ АЛЬБО ПІСЬМОВЫЯ ТЭКСТЫ ПАЛІТЫЧНАГА ХАРАКТАРУ БУДУЮЦЦА НЕ ТОЛЬКІ НА СІСТЭМЕ ФАКТАЎ І ПРАГНОЗАЎ, ЯКІЯ ЗВЫЧАЙНА БЫЦЦАМ БЫ ВЫЯЎЛЯЮЦЬ МЭТЫ ПАЛІТЫКА. НАСАМСПРАВЕ ІСНУЮЦЬ БОЛЬШ ТАЯМНІЧЫЯ МЕХАНІЗМЫ, ШМАТФАКТАРНЫЯ ПРЫЧЫНЫ ЎЧЫНКАЎ І ІХ НАСТУПСТВАЎ, ЯКІЯ ЧАСАМІ ЖЫВУЦЬ У ПАДСВЯДОМАСЦІ ПАЛІТЫКА І НЕ ВЫСОЎВАЮЦЦА НЕПАСРЭДНА Ў ПРАМОВЫ, АРТЫКУЛЫ ДЫ ПРАГРАМЫ, АДНАК СПАКВАЛЯ ЎЗНІКАЮЦЬ У ТЭКСЦЕ ПРАЗ АСЭНСАВАННЕ ЛОГІКІ АЛЬБО НЕЛАГІЧНАСЦІ АКЦЭНТАЎ, ІХНІХ ЛАБІРЫНТАЎ, МУДРАГЕЛІСТЫХ ПЕРАХОДАЎ І ЗРУШЭННАЎ.

Хтосьці з вялікіх ужо асцвярджаў, што словы палітыка на тое і ёсць, каб хаваць ад людзей ягоныя сапраўдныя намеры, і гэта бясспрэчна, але ўсялякая таямніца мае свае чыннікі і звілістыя сцежкі, кожнай таямніцы – свой час галоснасці, да якога пройдзе хвіліна, тыдзень, год альбо, нарэшце, эпоха, аднак таямніцы ўсё ж адкрываюцца насуперак жаданням, допускам, камандам і цэнзурным забаронам любога рэжыму.

Палітычная культура вымагае ўвагі да таго, што, як і пры якіх вонкавых ды асабістых акалічнасцях, укладваючы які патаемны сэнс у словы і ўчынкі, давёў пэўны палітык.

Выходная пазіцыя мае за выснову агульнавядомую аксіёму, -- словы пераважнае большасці ўдзельнікаў палітычнага працэсу былі, ёсць і будуць не болей, чым словы.

Зрух паветра, так бы мовіць, зрэдчас супадае з думкамі і таямнічымі мэтамі вядомае персоны. Асабліва калі гэтая персона сталася носьбітам улады і ягонае жыццё на адносна працяглы тэрмін ужо не залежыць ад тых, хто вымушаны слухаць, глядзець альбо чытаць ягоныя стандартна-эмацыянальныя, а часам і бязглузда-выбуховыя опусы, разлічаныя на не дужа дасведчанага гледача, што рэагуе станоўча на вонкавыя эфекты і прымітыўна-трапнае слоўца ды нарэшце спрычыніць неадэкватную сімпатыю, а то і далёкую ад логікі і жыццёвае праўды фанатычную падтрымку.

Падманлівыя опусы ўздымаюць рэйтынг, зарабляюць галасы на выбарах, адтэрміноўваюць выкрыццё хлусні і вяртанне грамадства да горкае праўды. За такімі опусамі амаль ніколі не назіраецца жывая і карысная супольніцтву справа.

Сёння пэўныя палітыкі заладзілі гаману пра тое, што нібыта наступіла стабілізацыя ў беларускай эканоміцы, хоць відавочна, што да гэтага, даруйце, як да поўні. Жабрацтва, якое апранае фрак, сатканы з пыхлівых словаў, застаецца ў непрагляднай беднасці, нават выступаючы з трыбуны ААН.

Дарэчы, стабілізацыю ў багне можна тлумачыць інакш, -- тым, што мы патанаем, каламутная вада самкнулася над намі, і наступіла цішыня, быццам увогуле нічога не здарылася. Часцяком у свеце адзіная адзнака стабілізацыі, якая застанецца, ёсць смерць. Адыходзіць у лепшы свет дзяржаўнасць, якою так пагарджалі.

Жорсткі крызіс, памножаны на памылкі, ідэалогія настальгіі замест рэальнай рэформы, сіндром варожасці да ўсялякага апанента, адсутнасць дыялогу з палітыкамі іншай арыентацыі, ледзь прыхаваная канфрантацыя з расейскімі лідэрамі, халодныя адносіны замежжа, слабы патэнцыял дараддзаў, -- вось што тоіцца пад фракам уяўнай стабілізацыі.

Акцэнт як лагічны альбо, мажліва, і алагічны націск, які часцей за ўсё робіцца мімаволі, праяўляе, нібыта лакмусавая паперка, псіхалагічную матывацыю таго, што гаворыцца, а таксама супярэчлівасць, тое, што адрознівае слова ад сэнсу, прылюдны пафас у ацэнках ад існасці.

Напрыклад, зусім нядаўна высокая асоба абвясціла, што рыхтуецца дакумент, накіраваны супраць антыдзяржаўнай, антыпрэзідэнцкай дзейнасці, аднак логіка дыктуе іншую інтэрпрэтацыю: антыпрэзідэнцкая дзейнасць можа быць фактам звычайнай палітычнай барацьбы, які не мае нічога агульнага з крымінальнай антыдзяржаўнасцю.

Нялішне было б прыгадаць, што прыкравядомая савецкая маналітнасць – гэта родная маці двулікасці ўладаў, якія добра навучыліся думаць аб адным, казаць пра другое і рабіць зусім іншае. Маналітнасць міжволі спарадзіла таксама і натуральныя феномены супрацiўлення, дысідэнцтва і палітычнага іншадумства ў розных грамадствах.

Нашая краіна нібыта перахварэла маналітнасцю, хоць і не верыцца, што палітычная сістэма цалкам усталявалася і дасягнула сталасці. Мо з гэтае прычыны ўсё не здаецца цяга да неіснуючай у прыродзе сацыяльных феноменаў маналітнасці.

На агульнапрынятую апазіцыйную дзейнасць у межах законаў навідавоку накідваецца сэнсавы акцэнт амаль крымінальнай антыдзяржаўнасці. Алагічны націск пастаўлены пад час эмацыянальнай, але далёка не выпадковай прамовы, бо пазней думкі зафіксаваныя афіцыёзнай прэсай, і сведчаць пра тое, што тая высокая асоба атаясамлівае сябе, даволі самотнага палітыка, з дзяржавай, што мяняе статус гэтае асобы, завышае яе, штучна выводзіць з-пад крытыкі і ставіць на недасягальную для іншых палітыкаў вышыню, параўнальную адно што з уладай манарха.

"Дзяржава – гэта я", – колісь было сказана. Трапна ды досыць нахабна, і наўрад ці хто даў бы веры, калі б пачуў, што такое паўторыцца ў цэнтры Еўропы напрыканцы XX стагоддзя.

Безумоўна, гэты акцэнт падказвае непрыхаванасць задумаў, штосьці накшталт ва-банкавай адкрытасці, ад якой не тое, што палітыкі, а нават людзі, не абцяжараныя высокай адказнасцю, звычайна адмаўляюцца ў сваіх пасядзённых адносінах, але таму мы і абралі выпадак за ўзор, дзеля яснасці.

У жыцці такія эскапады сустракаюцца надта рэдка, носьбіты дзяржаўнае ўлады -- не аматары прамых ліній шчырасці ў адносінах да сваіх патаемных намераў, яны прыхільнікі складаных, зграбных крывых, якія захоўваюць імідж, але ўсё ж не допускаюць нікога за абалонку ўласнага публічнага слова. Спроба зазірнуць за тую абалонку жорстка спыняецца альбо караецца. Старых сродкаў і метадаў, вядома ж, досыць у арсенале чалавецтва.

Гэта не тычыцца хіба што ўнікальных асобаў, як, напрыклад, Вацлаў Гавел, які паказаў усім жыццём неверагодную ў нашыя дні здольнасць служэння праўдзе ва ўсёй яе складанасці і незалежна ад акалічнасцяў, ставячы гонар і годнасць значна вышэй за выгоды ўлады, якую большасць палітыкаў лічыць вяршыняй свету.

Вопыт пакаленняў даказвае: амаль заўжды перамагаюць наймацнейшыя ўладалюбцы, якія нічым не грэбуюць дзеля гэтага, яны адчуваюць, што нават смерць адступіцца ад іх у гадзіну шаленства славы.

Потым высвятляецца, што гэта не так, смерць не падманеш атрыбутамі зямное магутнасці, але хіба варта тое, што будзе потым, па-за часам і ўладай, калі яна ёсць і трымаецца моцнымі хоць на час рукамі!

Зрушэнне акцэнтаў сталася ўлюбёнай зброяй тых, хто ставіць карту на дэмагагічныя прыёмы маналогу перад народам і папуліцкую інтуіцыю, а таксама разлічанае на публіку квазізазрэнне, якое люд часцяком прымае за фенаменальную шчырасць.

Найвялікшым зрушэннем акцэнтаў сучаснасці можна лічыць прапанову аб рэферэндуме ў краінах з прымітыўнай палітычнай культурай, дзе людзі не валодаюць элементарнымі ведамі і пазбаўленыя свабоднай, а гэта значыць дакладнай інфармацыйнай прасторы. Ацэнка рэчаіснасці грамадзянінам без шырокага набору ведаў і незалежнай інфармацыі ёсць плён дылетанцтва і наўмыснага падману.

Раіцца з народам, які адлучаны ад рэальных палітычных ведаў праз жорсткую манаполію на СМІ, тэлебачанне і радыё, але верыць, што ён свабодна выбірае, гэта як пытацца ў глуханямога, навошта ён выкрыкваў антыпрэзідэнцкія лозунгі.

Тут адзіная мэта – легалізаваць сябе ва ўладзе на працяглы тэрмін нібыта дэмакратычным шляхам.

Сама фраза "буду раіцца толькі з народам" мае ліслівы падтэкст у адносінах да тых, каго трэба "купляць", хто дэ-факта параіць амаль нічога не можа, але з лёгкасцю прыме словы за праяву выключнага дэмакратызму кіраўніка. Пры гэтым народ ледзь-ледзь, але ўсё ж не адчувае зрушэння акцэнтаў насуперак элементарнай логікі. Справа ў тым, што лідэры палітычных партый і рухаў не выказваюць адно сваіх асабістых перакананняў, а прадстаўляюць шырокі дыяпазон імкненняў і інтарэсаў людзей, а таму і маюць законнае права на ўвагу ды павагу ўладаў, на тое, каб з імі раіліся .

Аднак люд звычайна расплюшчвае вочы тады, калі надта позна, і толькі збольшага свядомая меншасць б"ецца, нібыта рыба аб лёд, бо без сродкаў масавай інфармацыі, без інфармацыйнага парытэту нічога не зробіш. Доказам служаць асноўныя заўвагі замежных экспертаў, якія назіралі за мінулымі выбарамі ў парламент.

Вось і ўвесь разлік – словы працуюць на ажыццяўленне зусім іншых намераў. Словы ўрэшце мо і забудуцца – застанецца адно што доўга і марудна расхлёбваць навязаныя справы, якія адкідваюць нас у мінулую імперыю абмежавання правоў і свабодаў, у імперыю бясправя, якая, як мы лічылі, адышла ў нябыт, і не таму, што трое зубраў гэтак схацелі, а выключна з-за цяжкіх хваробаў наменклатурнай распусты і палітычнага канцэрту.

ГІСТОРЫЯ ДОБРА ЗАСВОІЛА, ШТО ІМПЕРЫІ РАСПАДАЮЦЦА САМІ АДПАВЕДНА ЗАКОНАЎ РАЗВІЦЦЯ І ЗАНЯПАДУ ШТУЧНЫХ ФАРМАЦЫЯЎ, А НОВЫЯ НЕЗАЛЕЖНЫЯ КРАІНЫ СВЕТУ, ЯКІЯ ЗАМЯНІЛІ ІМПЕРЫЮ, ДА ПАРЫ ВЫГЛЯДАЮЦЬ НІБЫТА ЯК АСКОЛКІ РАЗБІТАГА ЛЮСТЭРКА. АДНАК З ЦЯГАМ ЧАСУ ГРАМАДСТВА, КАЛІ ЯНО ЎСВЕДАМЛЯЕ СЭНС СВАЁЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ І АДКАЗНАСЦІ, РАЗУМЕЕ, ШТО НАЙВЯЛІКШАЙ КАШТОЎНАСЦІ – СВАБОДЫ – ТРЭБА ДАМАГАЦЦА СЁННЯ. ДЗЕЛЯ ГОДНАЕ БУДУЧЫНІ.

Ольга ЧАЙКОВСКАЯ

ОЛЬГА ЧАЙКОВСКАЯ – ИЗ ТЕХ ЗНАМЕНИТЫХ ПУБЛИЦИСТОВ, ЧЬИ ВЫСТУПЛЕНИЯ В "ЛИТЕРАТУРНОЙ ГАЗЕТЕ" В 70-80-ЫХ ГОДАХ БУДИЛИ ОБЩЕСТВО, СЛУЖИЛИ НАМ НАДЕЖДОЙ НА ОСВОБОЖДЕНИЕ ОТ ТОТАЛИТАРИЗМА. В ГАЗЕТЕ "КРУГ" ОНА ВЫСКАЗЫВАЕТСЯ ПО ОДНОМУ ИЗ ВОПРОСОВ ПРЕДСТОЯЩЕГО РЕСПУБЛИКАНСКОГО РЕФЕРЕНДУМА – ОБ ОТМЕНЕ СМЕРТНОЙ КАЗНИ.

САНИТАР НАЗЫВАЕТСЯ: ПАЛАЧ

ГЕРОЙ фильмов ужасов Дракула – лицо историческое, это валашский князь Влад (середина XV в.), но нам интересен не он, а тот русский, который о нем написал ("Сказание о Дракуле", конец XV в.): то был дьявол, зверски жестокий, очень коварный; заявил, например, турецкому султану, что готов перейти к нему на службу со всем своим войском, султан согласился, а Дракула, войдя в глубь его владений, стал громить города, жителей "одних на колья сажал, других разрубал надвое и сжигал, не щадя и грудных младенцев".

"Султан ничего не мог с ним поделать, -- заключает автор, -- только себя опозорил", -- вот странный вывод, не так ли? В том-то и дело, что сознание автора раздвоено. Он знает, что в своей земле князь свирепствовал не меньше (его и прозвали "Цепеш" – сажатель на кол), и тут же добавляет: он "так ненавидел зло в своей стране", что казнил любого, незнатного и знатного (для последнего у него полагался особый кол, толстый и золоченый), "если тот украдет, или ограбит, или обманет, или обидит". Встретил человека в ветхой рубахе и велел отрубить руки его жене, а труп ее посадить на кол – зачем не сшила мужу новую. "Так грозен был Дракула". Однажды созвал в своей земле всех нищих и немощных, устроил им пир в особых хоромах; когда они насытились, спросил, хотят ли они быть счастливы и ни в чем не нуждаться, а получив восторженное согласие, велел запереть хоромы и сжег всех живьем. "Знайте, -- объяснил он окружающим, -- почему я так сделал", чтобы не осталось в его земле бедняков, одни богатые.

Смерть как орудие справедливости. Смерть как орудие социальной гигиены.

До Ивана Грозного, который был, конечно, чистым Дракулой, оставалось полвека. Петр I тоже недалеко ушел от Дракулы и раздваивался еще больше: этот просветитель России самолично рубил головы. И наконец – Сталин. Все трое были "мудры и жестоки", в правовой системе всех троих человеческая жизнь не стоила и медного гроша, у всех троих нашлось неисчислимое множество исполнителей (любопытно, что все они, включая самого Дракулу, несомненно были психически нездоровы – есть над чем подумать в плане социальной психопатии). Дракула казнил за ветхую рубашку. Петр – за срубленное дерево. Сталин – за колоски. А сама идея, согласно которой можно уничтожить часть народа, чтоб другой части жилось хорошо, -- разве она не от Дракулы?

Разумеется, был в России и другой нравственный мир, иное отношение к человеческой жизни и в народе, и в правительственных кругах. Елизавета Петровна поклялась, что в ее правление никто не будет казнен; при ней сенат указом 1744 года отменил смертную казнь (она применялась только по именному указу). Екатерина выступила в своем "Наказе" против смертной казни. Но и при Елизавете, и при Екатерине человек мог погибнуть под ударами кнута (умелый палач убивал с трех ударов). Позднее казнь на эшафоте применялась редко, зато свирепствовали шпицрутены – подлейшая казнь, когда палачами солдата становились его товарищи, сотня на одного.

АРГУМЕНТАЦИЯ сторонников смертной казни известна, их главный довод: только страх перед расстрелом может удержать руку убийцы – мысль неверная, основанная на совершенном непонимании отношения человека со смертью. Мы, смертные, живем и не помним о смерти, тут наше сознание прочно заблокировано. И хотя в нынешний век бешеных скоростей и ненадежных механизмов она может в любой час настигнуть любого, ее в нашем представлении как бы и вовсе нет.

Преступник, который всё обдумал и рассчитал, не думает об Уголовном кодексе с его наказаниями, в частности и о смертной казни. Что же говорить о преступлениях неумышленных, а таких подавляющее большинство (90-95%), совершенных под воздействием момента, под натиском страстей, когда сознание едва ли не выключено, здравый смысл на ноле и нет ни малейшего представления о последствиях.

Смертная казнь не защищает общество от преступности, это доказано многочисленным экспериментальным материалом (так, например, в Англии в 1965 году смертная казнь за убийство была отменена экспериментально; через пять лет, убедившись, что преступность не увеличилась, смертную казнь отменили окончательно), сравнением статистических данных стран, где существует смертная казнь и где ее много лет назад отменили, -- уровень преступности в этих странах примерно одинаков.

Там же, где война, особенно гражданская, или революция становятся делом обычным, когда отменена заповедь "не убий" и с души снят этот великий запрет, там общество дичает, и надолго, потому что дичают дети – во время Французской революции они гильотинировали птиц, собак и кошек, в нашу пугачевщину могли играя повесить сверстника, в 30-е годы, когда советская власть подняла на классовую борьбу несмышленых ребят, маленькая девочка мечтала, чтобы убийцу Павлика Морозова отдали ей и она казнила бы его, отрезая от него по кусочку маленькими ножницами.

И мы одичали. Профессия палача уже не вызывает в нашем обществе отвращения – не случайно при опросе телезрителей в Санкт-Петербурге нашлись люди, которые не только приветствовали смертную казнь, но и заявили о своей готовности быть ее непосредственными исполнителями. А "демократические" и недемократические митинги, которые кричат "К стенке!". А это повсеместное требование расстрелять (по отношению хотя бы к продавщице, если она что-то недовесила) – совсем по Дракуле.

Прибавьте к этому печать и особенно кино и телевидение, которые десятилетиями приучали людей к убийствам, показывая повешенных, зарубленных, расстрелянных, -- могло ли все это пройти бесследно для духовного здоровья народа?

УБИЙСТВО от имени государства никого не пугает и не тревожит. "А что тут такого? Никакой трагедии тут нет – расстреляли опасного преступника, одна только польза". Те, кто так говорит, не знают, что такое смертная казнь (одно время было предписание, чтобы судьи, вынесшие приговор, присутствовали при его исполнении; впечатление было чудовищное: одно дело подписывать бумагу, и совсем другое – видеть). Казни они не видели, но ведь Достоевского многие из них читали, уж ему-то можно верить, человеку, пережившему собственную казнь и те минуты, когда "... знаешь наверное, что вот через час, потом через десять минут, потом через полминуты, потом теперь, вот сейчас – душа из тела и вылетит, и что человеком уже больше не будешь, и что это уже наверное". Сторонников высшей меры эти строчки, как видно, не трогают. "Убийца, -- говорят они. – Сам виноват".

А если не убийца? Если произошла судебная ошибка, как тогда?

Согласитесь, довод неопровержимый. Если возможна судебная ошибка, как же тогда возможна смертная казнь?

А судебная ошибка возможна при самой оптимальной судебной системе, даже и в суде присяжных – ее причиной может быть случайное сцепление обстоятельств, социальные пристрастия, национальная ненависть, некомпетентность юристов, изначальная фальсификация со стороны работников следствия.

Можно опровергнуть подобный ход рассуждений?

С легкостью. В сталинские времена рассуждали просто: если из ста человек девяносто будут наказаны правильно, значит, в процентном соотношении борьба с преступностью идет эффективно. О тех, кто попал в десять процентов, речи не было. Но и сегодня можно услышать: "Пусть кто-то и погибнет по ошибке, зато будет гарантия, что истинные преступники будут стерты с лица земли". Когда за убийство, которое совершил Чикатило, расстреляли Александра Кравченко, а самого Чикатило оставили на свободе, он растерзал еще более пятидесяти человек – вот она, цена ошибки. Но еще не вся. Когда приговор по делу Кравченко был отменен, у следственной группы, возглавляемой Костоевым, был невеселый день: предстояло известить родных расстрелянного. Письменное извещение казалось немыслимым, кому-то нужно было ехать, рассказать. И ни у кого не было на это сил.

--Вот, -- говорил Костоев, -- придем к старикам и скажем: несколько лет назад государство совершило преступление, именем Российской Федерации убили вашего сына. А теперь мы пришли вас порадовать: ваш сын был невиновен, его убили ни за что. Так кто же из нас едет?

Попросили знакомого сотрудника прокуратуры, который ехал в те края. Он в дальней деревне нашел домик, а в нем старую женщину. И похолодел, когда она стала ему рассказывать, что у нее сын в колонии, почему-то от него нет долго писем, а на запросы ее никто не отвечает.

Ей даже не сообщили о смерти сына – вот она, цена человеческой жизни.

НО ОДНАЖДЫ меня с моих несокрушимых позиций – решительное отрицание самой возможности смертной казни – сбила та же самая реальная жизнь.

В областном суде судили двадцатилетнего парня, убившего семилетнюю девочку, -- убийца встретил ее, когда она через лесок бежала из школы.

В зале сидела молодая женщина, мать погибшей. Она не билась в рыданиях, не падала в обморок (что иных на время спасает от невыносимой душевной боли), она даже не плакала – была спокойна, как спокойны мертвые. В процессе участия не принимала (хотя юридически была его участницей), только время от времени вставала, мерным голосом просила у судьи разрешения задать вопрос подсудимому и спрашивала все одно и то же:

--Ведь моя дочка так просила оставить ее в живых, почему же ты ее убил?

А парень равнодушно молчал (о чем, мол, разговор, и так ясно: убил как свидетеля).

И тут я вдруг поняла, что этим двоим нельзя жить на одной земле: если оставят в живых убийцу, мать вернее всего сойдет с ума от сознания, что он где-то живет, а потом выйдет на свободу. И вот я, противница смертной казни, я, знающая, почему она немыслима и невозможна, я хотела одного -- чтобы парня этого не было на свете. Я смотрела на него, молодого, только начинающего жить (и вообще говоря имеющего возможность исправиться), и ужасным образом хотела его смерти (и до сих пор рада, что нет его на свете – даже так!). Думаю, что и слова наших великих писателей, восставших против смертной казни, в ту минуту меня вряд ли бы тронули.

И ВСЕ ЖЕ так нельзя. Нельзя, и это важно понять.

Проблема убийства, в том числе и законного, страшна, и нет у нее решения, на котором бы "сердце успокоилось". Велика мука женщины, у которой убили ребенка, и все-таки решать проблему смертной казни, имея масштабом степень ее мучений, тоже никак нельзя. Есть ведь и другая мать, та, что, выслушав смертный приговор сыну, ждет каждый день, каждый час – может быть, его уже ведут в последний путь, а ей даже тела его не выдадут. Две чаши весов (Фемида всегда взвешивает все "за" и "против" в делах, проходящих по ее ведомству), в обеих хватает слез и крови. Нетрудно предвидеть возражение: в страданиях обеих матерей виновен один и тот же человек, -- тот, кто убил.

Это верно, но если опять же вспомнить о возможности судебной ошибки, все предстанет совсем в ином свете. Весы тут вовсе перекосит, на одну их чашу навалится огромный груз: безмерные страдания невинно казненного и тех, кому он дорог; зловещее торжество беззакония; безнаказанность преступника, а с ней и возможность новых убийств. Сколько бы мы ни сочувствовали родным убитого, ТАКОГО груза на весах справедливости (юстиции) их страдания перетянуть не могут.

Говорят: вступление в Совет Европы требует отмены смертной казни. Это не вступление в СЕ требует, это жизнь грозно требует. При нынешнем состоянии следственного аппарата и судебной системы высшая мера наказания невозможна, просто немыслима, она должна быть отменена незамедлительно – пока нет новых жертв.

Анатолий СТРОЕВ, собственный корреспондент газеты "Круг"

ОШИБАЮЩИЙСЯ ПРОРОК ?

СУДЬБА ПРАВОЗАЩИТНИКА СЕРГЕЯ КОВАЛЕВА

Сразу после того как вместо тишины и мира на земле Чечни начались крупномасштабные боевые действия, а в Москве, после взрывов двух троллейбусов, милиция стала хватать для установления личности "лиц кавказской национальности", -- появилось письмо Сергея Адамовича Ковалева, которое не решились озвучить столь кичившиеся своей независимостью российские телекомпании, а напечатать осмелились лишь второразрядные московские газеты.

***

Накануне пышной инаугурации Бориса Ельцина известный правозащитник обвинял его и генерала Александра Лебедя в том, что они обманули российский народ и не установили желанный мир в Чечне. Он все о ней – о Чечне. И я начинаю думать: могла ли вспыхнуть на российском политическом небосклоне столь яркая звезда – Сергей Ковалев, не будь чеченской войны?

Ведь до нее было предстояние гражданской войны в октябре 1993-го, когда Ковалев, будучи депутатом Верховного Совета и председателем комитета по правам человека ВС, безоговорочно встал на сторону Бориса Ельцина и поддержал его некоторые, скажем мягко, антиконституционные действия. Этот его поступок припоминают Сергею Адамовичу и его враги, и его друзья. Да и обыватель не прочь позлословить в его адрес: мол, этих "проклятых" чеченцев защищает, а своих не пожалел!

Сергей Адамович както трудно, словно переступая через самого себя, пытается объясниться с людьми: "Я и сейчас думаю, что действия президентской администрации 3 и 4 октября были, может, и не самыми удачными, но необходимыми, вынужденными. Они диктовались чрезвычайными обстоятельствами, чрезвычайной опасностью, угрозой гражданской войны..."

Лишь спустя время, побывав под пулями и бомбами в сражающемся Грозном, Сергей Ковалев сделает иное, очень важное открытие: события 1993-го года имеют прямую связь с тем, что произошло потом на Северном Кавказе. Правда, Ковалев считает, что именно после октябрьских событий 1993-го Борис Ельцин уверовал в то, что он "человек критических ситуаций, что у него есть особый дар, особая интуиция именно в таких обстоятельствах принимать резкие и правильные решения, которые потом приведут к замечательным результатам."

Я наблюдал за Сергеем Адамовичем, когда он пытался встретиться с Борисом Ельциным и рассказать ему "всю правду о войне в Чечне". Ковалев был искренне уверен, что как только президент узнает, что творят российские военные на чеченской земле, так эта кровавая бойня прекратится. Встреча состоялась – еще год назад. А Грозный снова в руинах...

А перенесший инфаркт Сергей Адамович в скверике возле памятника Пушкину дает интервью журналистам: если боевые действия в Чечне не прекратятся, он обратится к международному сообществу и попросит его вмешательства во внутренние дела России...

***

Да кто он – Сергей Ковалев? Кто наделил его такими правами? Почему его высказывания комментируют чуть ли не ежедневно все средства массовой информации? Или, наоборот, замалчивают, делают вид, что его и вовсе не существует?

Своеобразную кривую его жизни "вычертил" журнал "Итоги" – из знаменитых папирос "Беломорканал": родился в 1930 году на Украине в семье учителя; в 1948 году поступил в медицинский институт, а через три года перевелся на биофак Московского университета, который окончил в 1953-м; работал в одном из институтов Академии наук СССР, защитил кандидатскую диссертацию... В 1966-м Сергей Ковалев отправил властям письмо с протестом против преследования Александра Гинзбурга, против суда над Синявским и Даниелем.

Диссиденство, видно, свойство его характера, а вовсе не благоприобретенные черты характера в стране, в которой права человека вовсе не были правами человека, -- они целиком принадлежали всемогущему государству, и оно решало, каким быть человеку, как и сколько учиться, где жить и не жить, что читать и что смотреть, куда ехать, о чем мечтать. Впрочем, как выяснилось после 1991-го года, диссидентами были многие. Вот только узнали мы об этом тогда, когда узнавать стало не опасно.

Сергей Ковалев стоял в оппозиции к властям бывшего СССР легально, за что и был осужден и приговорен к семи годам лагерей и трем годам ссылки. Отбывал наказание в знаменитой Пермской политзоне, затем ссылку – в не менее знаменитом Магадане. Освободившись в 1984-ом году, он поселяется в тогдашнем Калинине.

***

Крыніцай прагрэсу можа быць толькі ўздым уласнай культуры, якая з'яўляецца правадніком агульначалавечых каштоўнасцей. Не разумець гэтага, праводзіць палітыку на прыгнечанне і знішчэнне таго, чым толькі і можа ганарыцца народ, значыць знішчаць у кожным з нас пачуццё ўласнай годнасці.

Калі дарослы чалавек, у якога ўжо сфарміраваліся ўласныя погляды на каштоўнасці, можа неяк супрацьстаяць цяжкай хвалі, то падрастаючае пакаленне бяздумна ўбірае ў сябе тыя ілжывыя ідэалы, каштоўнасці, густы, погляды, якімі жыве грамадства. Кумірамі маладых становяцца супер-чалавекі са стальнымі мышцамі, моладзь выдатна засвойвае правілы, па якіх ёй прыйдзецца жыць у грамадстве, дзе цэніцца перш за ўсё "ўменне круціцца", "уменне жыць" і "дзелавая хватка".

Уладзімір АРЛОЎ

ІВАН ГРОЗНЫ І ПОЛАЦК

ЯШЧЭ І СЁННЯ КАЛЯ СЦЕНАЎ СВЯТОЙ САФІІ Ў МАІМ РОДНЫМ ГОРАДЗЕ ПОЛАЦКУ АД ЭКСКУРСАВОДА МОЖНА ПАЧУЦЬ ЗАМІЛАВАНЫЯ СЛОВЫ ПРА ТОЕ, ЯК ЦАР ІВАН ГРОЗНЫ "ОСВОБОЖДАЛ ПОЛОЦК ОТ ЛИТОВСКИХ ФЕОДАЛОВ". БОЛЬШАСЦІ ТУРЫСТАЎ І НЯЎЦЯМ, ШТО ТАКІЯ АПОВЯДЫ НЕ ПРОСТА БЯСКОНЦА ДАЛЁКІЯ АД ГІСТАРЫЧНАЕ ПРАЎДЫ. ЯНЫ АБРАЖАЮЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ГОДНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ, ЗНЕВАЖАЮЦЬ ПАМЯЦЬ ТЫСЯЧ БЯЗВІННЫХ АХВЯРАЎ.

1558 ГОД. Маскоўскае войска з агнём і мячом уварвалася ў Лівонію. Шукаючы падтрымкі, лівонскі магістр прызнаў сябе васалам Вялікага Княства Літоўскага. Беларуска-літоўскія палкі гетмана Радзівіла Рудога рушылі на дапамогу лівонцам. Вялікі князь і кароль Жыгімонт Аўгуст прапанаваў цару Івану IV узаемна адвесці войскі, але той меў іншыя планы. "Мы з'яднаем свае сілы, каб Польшча і Літва не выслізнулі ад нас", -- пісаў ён нямецкаму імператару.

Вайна Лівонская ператварылася ў вайну Літоўскую. Царскія ваяводы павялі сваіх стральцоў на Беларусь. Князь Андрэй Курбскі хадзіў на Віцебск. "Острог взяли и пожгли, -- апавядае маскоўскі летапісец, -- и посады у города у Витебска все пожгли и наряд в остроге поймали и людей в остроге многих побили и села и деревни около Витебска пожгли и повоевали." Апрача касцёлаў, Курбскі спаліў дваццаць чатыры праваслаўныя храмы і люта расправіўся з беларускім палонам.

"Уся Літва ёсць вотчына гасудароў маскоўскіх!" – абвясціў Іван IV на саборы, а дваране сказалі: "Мы, халопы царскія, за адну дзесяціну зямлі Полацкага або Азярышчанскага павету галовы скласці гатовыя". Масковія рыхталася да вялікага паходу.

Захопніцкія планы, як заўсёды, прыкрываліся абяцаннямі вызвалення адзінаверцаў.

Які ж быў наш "вызваліцель" у сапраўднасці?

Каб не здавацца занадта старонным, дам слова славутым расійскім гісторыкам. М. Кастамараў называў Івана IV "чудовищем, которое лжет в каждом слове", В. Ключэўскі -- "зверем от рождения", а С. Салаўёў пісаў, што гісторык ніколі не прамовіць такому чалавеку слова апраўдання.

У ДЗЯЦІНСТВЕ цар любіў бавіцца, скідваючы з высокіх дахаў катоў і здзекуючыся з дробнай жывёлы. Гадоў з пятнаццаці пачаў "упускаць" з вышыні таварышаў сваіх дзіцячых гульняў і з асалодаю глядзеў, як тыя канаюць. Калі цару прывезлі з Персіі слана, ён закамандаваў таму стаць перад памазаннікам Божым на калені. Няшчасная жывёліна, не ведючы рускае мовы, не паслухалася і была за гэта пасечаная на кавалкі.

Цар катаваў колішніх сяброў, уласнаручна зарэзаў у застоліцы князя Абаленскага-Аўчыніна, абарваў жыццё свайго сына... У часы так званай апрычніны царовы слугі цэлы месяц забівалі ў Ноўгарадзе штодня па 500 чалавек.

Крывавая тыранія напоўніла краіну даносчыкамі і катамі. "Няхай цар пакажа нам сваіх здраднікаў, а мы самі вынішчым іх", -- крычалі на плошчах сталічныя купцы і мяшчане. "На рабы своя, от бога данныя ему, жестокосерд вельми, и на пролитие крови и на убиение дерзостен и неумолим... множество народу от мала и до велика при царстве своем погуби", -- сказаў пра Івана IV маскоўскі летапісец. І побач, таксама пра яго: "Муж чюдного рассуждения, в науке книжного поучения доволен и многоречив зело."

Шмат присвечаных цару захопленых слоў знойдзецца і ў рускім фальклоры. Рэкі крыві, войны і захопы чужых земляў успрымаліся як доказы багаабранасці Івана IV, што, маўляў, змагаецца з ворагамі ў дзяржаве і за яе межамі. Рускі нацыянальны характар атрымаў у тыя часы наймацнейшую прышчэпку манархічных ілюзій. Менавіта гэты цар пакінуў Расіі ў спадчыну ўжо цалкам сфармаванае самаўладдзе, што трымалася на тэроры супроць свайго народу. (Нядзіва, што Іванам Грозным захапляўся Сталін.)

НА ПОЛАЦК, калі верыць маскоўскім пісцам, цар вёў 200 тысяч конніцы, 60 тысяч пяхоты і 80 тысяч абозных людзей. Гісторыкі лічаць такія лічбы моцна завышанымі і пагаджаюцца на 60 тысяч воінаў, але ўсё роўна гэта была велізарная сіла: здавалася, на Полацк вырушыла ўся Масковія.

31 студзеня 1563 года царскія палкі спыніліся на дзвінскіх берагах. Наперадзе ляжаў найбагацейшы горад Вялікага Княства і яго галоўная цвярдыня -- з дзевяцівежавым замкам, з дванаццаццю манастырамі і васемнаццаццю храмамі.

Невялічкі, у параўнанні з непрыяцелем гарнізон, ён здавацца, тым не менш, не збіраўся. Невядома, колькі яшчэ трывалі б аблогу нашы продкі, каб не памылкі ваяводы Станіслава Давойны. Першы раз ён спудлаваў, выправіўшы з горада дзве тысячы сялянаў, што ўмацоўвалі сцены. Ваявода хацеў паменшыць колькасць едакоў, але царскія людзі палавілі сялянаў і прымусілі іх паказаць лясныя ямы з гарадскімі запасамі збожжа.

Другі раз Давойна схібіў, калі адвёў абаронцаў у замак і падпаліў астрог з пасадамі. Пад прыкрыццём густога дыму стральцы ўварваліся ў горад і перацягнулі туды гарматы. У той дзень палоннымі сталі адзінаццаць тысяч навакольных сялян, што хаваліся ад "вызваліцеляў" за полацкімі сценамі. Цар раздаў палон князям, баярам ды "прыказным" людзям, і няшчасных пагналі ў Масковію.

14 лютага Грозны загадаў біць з вогненных гарматаў, і за пяць гадзін да світання полацкая фартэца загарэлася. Пасля сёмага варожага прыступу ваявода Давойна, епіскап Арсеній і лепшыя людзі ад шляхты выйшлі з замка і папрасілі літасці. Полацкая шляхта і пяцьсот "каронных рыцараў" адмовіліся здавацца і адбіваліся яшчэ некалькі дзён, аднак лёс горада быў вырашаны.

ЦАР ДАКЛЯРАВАЎ, што пакіне кожнаму палачаніну волю і маёмасць. Ваявода Давойна, быццам забыўшыся, што дзяржаўнага слова ў Маскові ніколі не трымалі, выступіў з замка з усім войскам і артылерыяй і стаў на вызначанае месца. Пасмяяўшыся з веры ў ягоныя абяцанкі, цар Іван акружыў палонных моцнай аховаю і загадаў пяць дзён не даваць ім есці. Гарадскі скарб і ўласнасць купцоў, шляхты ды ўсіх заможных жыхароў ён прысабечыў і адаслаў у сваю сталіцу. Мірных гараджанаў выгналі ў поле і таксама ўзялі пад варту.

Палоннае войска і жыхароў пайменна перапісалі, і цар узяўся чыніць суд. Абяцаную волю атрымалі толькі польскія рыцары, якіх надзялілі сабалінымі футрамі і адпусцілі на радзіму. Яны мусілі паведаміць каралю, вялікаму князю Жыгімонту Аўгусту, што маскоўскі валадар вайны не прагне, а хоча адно вярнуць "свае" Валынь, Галічыну і Беларусь да самае Вільні.

Ваяводу з сям'ёй, епіскапа Арсенія і дзесяткі знатных гараджанаў цар адправіў у палон у Масковію. Палоннымі абвясцілі ўсіх палачанаў. Шляхту, мяшчанаў і тых, хто хаваўся ў месце, Іван загадаў вязаць і гнаць на ўсход. Удзельнік вайны італьянец Аляксандр Гваніні, які быў віцебскім камендантам, у сваёй "Хроніцы Еўрапейскай Сарматыі" паведамляе, што маскоўскі цар вывеў з Полацка пяцьдзесят тысяч нявольнікаў. Польскі гісторык Мацей Стрыйкоўскі (ён на той час таксама служыў у Віцебску) дадае, што гналі іх не па-хрысціянску, а як іудзеяў да Вавілона: і кабет, і дзяцей вялі злыганых вяроўкамі і абы як апранутых. Людзей амаль не кармілі, і яны сотнямі паміралі на зімовых дарогах ад голаду і марозу.

Заваёўнікі панішчылі полацкае рыцарства, якое адмовілася перайсці на службу да тырана. Цар вынаходзіў ахвярам усё новыя катаванні. Палоннаму іншаземцу-найміту Андрэю Гессэ Іван Грозны за адмову служыць яму загадаў адстрэліць абедзве рукі па локаць, выкалоць адно вока і выпаліць палову барады, а потым адвезці з сям'ёю ў Маскву і трымаць там да смерці.

У горадзе жыло нямала іудзеяў. Ім, ад старых да немаўлятаў, выпала страшная доля – загінуць пад лёдам Дзвіны і Валовай азярыны. Пскоўскі летапіс апавядае: "Которыя были в городе люди жидове, и князь великий велел их с семьями в воду в речную вметати и утопили их."

Такі самы лёс напаткаў каталікоў. Царскія татары пасеклі шаблямі манахаў-бернардзінаў і пусцілі дымам іх храм. У той дзень апошні раз маліліся богу і полацкія браты-дамініканы. "Вызваліцель" вымагаў без усякага суда пазбаўляць жыцця ўсіх, хто хрысціцца не па-праваслаўнаму. Пасля той разні ў горадзе з'явіліся першыя мясцовыя каталіцкія святыя – пакутнікі Адам, Дамінік і Пётр, што загінулі ад стралецкіх шабляў.

ПАДАННЕ КАЖА, што ў Полацку, калі трэба было змацаваць грамату пячаткай, цар выганяў усіх прэч, каб не бачылі, як з ягоных рук капае кроў. А маскоўскі летапісец выводзіў: "Божиим же неизреченным великим милосердием и государьскою теплою верою к Богу и его государьским умыслом в Полотцску и в остроге ротмистров и королевских дворян и всяких воинских людей и черных из наряду много бесчисленно побили. И мы благодарим Бога и приснодевую Богородицу, заступницу христианскую о даре их великом... дабы и впредь даровали нам победу над всеми врагами зримыми и незримыми и давали мир и тишину со всеми странами..."

У рукі да маскавітаў трапіла бібліятэка Сафійскага сабора з цудоўнымі Скарынавымі выданнямі. Царскія дзякі разглядалі іх са здзіўленнем і засцярогаю: ці не ад д'ябла тое штукарства? У Вялікім Княстве Літоўскім друкарні існавалі ўжо сорак гадоў. У Маскові першая датаваная друкаваная кніга, дзякуючы Івану Фёдараву і Пятру Мсціслаўцу, з'явіцца толькі праз год пасля захопу Полацка. Каб вынішчыць памяць палачанаў пра сваю дзяржаву і колішнія вольнасці, царскія слугі палілі ці вывозілі старажытныя граматы. (Мо тады мы і страцілі бясцэнны Полацкі летапіс?)

Стральцы заходзілі ў чужыя дамы, як у свае. Збройнікаў, меднікаў, кавалёў змушалі задарма працаваць на цара. Раз-пораз найлепшых майстроў адпраўлялі пад вартаю ў Маскву. На дарогах панаваў разбой. Яшчэ нядаўна багатая зямля пусцела і галела. Маршалак Вялікага Княства Літоўскага Астах Валовіч назваў у тыя дні Прыдзвінне "няшчасным полацкім краем".

Мала каму з палонных ўдалося вярнуцца дадому. Тых, хто не застаўся ў сумётах, развезлі па розных гарадах і памесцях. 665 палачанаў па царовым наказе зарэзалі ў вязніцах. Камусьці пашанцавала вырвацца на волю і неяк уладкавацца на чужыне.

Полацк быў вернуты вялікім князем і каралём Стэфанам Баторыем толькі праз шаснаццаць гадоў. За гэты час горад і ваколіцы настолькі абязлюдзелі, што на адбудову ўмацаванняў бралі сялянаў з-пад Магілёва. З часоў царскага вызвалення Полацка ад самых палачанаў у гісторыі горада (перад Лівонскай вайной, ён, як сведчаць хронікі, "колькасцю і дабрабытам сваіх жыхароў пераўзыходзіў самую Вільню") яшчэ здараліся ўзлёты, але вярнуць сабе былога багацця і велічы ён ужо ніколі не змог.

БЯСПАМЯТНЫ ПАВЕРЫЦЬ НА СЛОВА НЕСУМЛЕННАМУ ГІСТОРЫКУ. БЯСПАМЯТНЫ БУДЗЕ ЗАХАПЛЯЦЦА ПЕРАВЫДАДЗЕНЫМ У БЕЛАРУСІ БЕСТСЕЛЕРАМ СТАЛІНСКІХ ЧАСОЎ -- РАМАНАМ РАСІЙСКАГА АЎТАРА В. КОСТЫЛЕВА "ИВАН ГРОЗНЫЙ", У ЯКІМ ЦАР-БАЦЮХНА ВЕРНА СЛУЖЫЦЬ НАРОДУ, А КЛАДЗЕЦЦА СПАЦЬ І ЎСТАЕ З АДНЫМ КЛОПАТАМ, "КАК СЛУЖИТЬ БОГУ И ИСТРЕБЛЯТЬ ВРАГОВ РОССИИ".

ЯШЧЭ АДНА ПРАЯВА ДОЎГАГА І ЦЯЖКАГА СНУ НАШАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ...

Алесь МАРЦІНОВІЧ

ВІНЦУК АДВАЖНЫ:

КСЁНДЗ, МУЧАНІК, ПАЭТ

"ЯК ЛЮДЗІ ГІНУЦЬ У САВЕЦКІМ САЮЗЕ, МЫ НІЧОГА НЕ МОЖАМ ДАВЕДАЦЦА: ЯНЫ ТАМ БЯССЛЕДНА НІКНУЦЬ, ЯК КАМЕНЬ У ГЛЫБОКАЙ ВАДЗЕ! ГІСТОРЫЯ СВЕДЧЫЦЬ, ШТО РОЗНЫЯ РЭЖЫМЫ МЕЛІ СВАЕ СПОСАБЫ ЗНІШЧЭННЯ ПРАЦІЎНІКАЎ: РЫМСКІЯ ЦЭЗАРЫ КРЫЖАВАЛІ, АЛЕ АДДАВАЛІ ЦЕЛА ЗАМУЧАНЫХ. ФРАНЦУЗСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ АДСЯКАЛА ГАЛАВУ, АЛЕ АДДАВАЛА ХОЦЬ ПАСЕЧАНАГА. ГІТЛЕР СТРАЛЯЎ, ТРУЦІЎ, ПАЛІЎ... АЛЕ ЗАСТАВАЎСЯ ХОЦЬ ПОПЕЛ. А САВЕЦКІ САЮЗ ПЕРАВЫСІЎ УСІХ – "ЛІКВІДУЕ"... І ЎЖО НІ АБ ЖЫВЫМ, НІ АБ ПАМЕРЛЫМ НЕ ЗАСТАЕЦЦА НІ ВЕСТКІ, НІ СЛЕДУ! АЛЕ ДА ГЭТАГА НАШ "ВОЛЬНЫ"-"КУЛЬТУРНЫ" СВЕТ ПРЫВЫК. ПРАПАЎ ЧАЛАВЕК ЯК МУХА, І НІЯКІ "ЧЫРВОНЫ КРЫЖ" ЯГО НЕ ЗНОЙДЗЕ!"

ЗА ГЭТЫМ СВЕДЧАННЕМ – УЛАСНЫЯ ПАКУТЫ ТАГО, КАГО СУДЗІЛІ ЗА ВЕРУ Ў БОГА. ЗА ТОЕ, ШТО РАБІЎ ЛЮДЗЯМ ДАБРО. ГЭТЫ ЧАЛАВЕК ГЭТЫ – ПІСЬМЕННІК ВІНЦУК АДВАЖНЫ. ЁН ЖА – БЕЛАРУСКІ СВЯТАР ЯЗЭП ГЕРМАНОВІЧ.

Цяжка, ох як цяжка кожнаму, хто нечакана-негадана быў пазбаўлены волі, трапіў за краты, а цяпер вымушаны гібець у лагеры! Гняце пастаянна тая няпэўнасць, што чакае цябе наперадзе, хоць, калі лепей разабрацца, наўрад ці можна назваць усё няпэўнасцю, бо наўрад хто і вытрымае дваццаць пяць гадоў прымусу, здзекаў, а ім, у пераважнай большасці, акурат па стольку і адмералі.

Не скупіліся: за 25 гадоў абавязкова змогуць перавыхавацца. І "перавыхоўваюцца". Хто адразу, як кажуць, аддае Богу душу, а хто, знясілены, не вытрымлівае, сам кідаецца ў бок вартавога, а той, ведама, як дзейнічае. Строга прытрымліваецца статутных патрабаванняў, а ў выніку – быў чалавек і няма яго. Знаходзяцца і тыя, хто на адкрыты супраціў не ідзе, але і незадавальнення свайго не хавае. Гэтага – у карцар. А могуць і крымінальнікаў нацкаваць, а гэтыя будуць мучыць паступова, па-садыцку -- глядзіш, праз некаторы час можна і звар'яцець.

Калі яшчэ знаходзіліся ў турме, і сама ішло следства, усе, хто трапіў за краты, нагадвалі авечак у катушку. Так цесна, што не павярнуцца. А цяпер, у лагеры? Канечне ж, яны таксама... авечкі, але авечкі ў вялікай загародцы. Як быццам свабодна можна перамяшчацца, але далёка не адыдзеш. Адзін у аднаго на віду!

Параўнанне з авечкамі ў Германовіча з'явілася тады, калі ён вырашыў адправіць Боскую Службу. Балазе, поруч знаходзіліся аднадумцы, гэткія самыя пакутнікі веры. Ды дзе там! Толькі паспрабаваў разгарнуць святое пісанне, як... Не тое, што насміхаліся суседзі па камеры, а гідлівасці сваёй не хавалі. Нічога не зробіш – паверылі ў ваяўнічы атэізм. А таму і паверылі, што пераважная большасць з іх і ёсць авечкі, а калі разам яны, няхай не падасца крыўдным, -- звычайная атара, не людзі.

У бараках – цесната: куды ні падасіся, бачаць усе ўсіх. Паспрабуеш ва ўмывальню падацца, каб застацца сам-насам, -- абавязкова нехта будзе і там. Ды і дзяжурны разпораз зазірае: не дае доўга затрымлівацца.

Баракі збудаваны так, што няма ніводнага кутка, які б не знаходзіўся пад наглядам часавых, што ўдзень і ўночы нязменна стаяць на вышках. Каб адправіць службу, да яе спачатку трэба падрыхтавацца. Ён паспрабаваў было. І адразу ж паплаціўся за свой намер. Неяк паставілі ўсіх у шарэнгі на дварэ і пачалі рабіць "рэвізію", забіраючы тое, што забаронена. Тады і знайшлі ў яго дзве маленькія кніжачкі, з якімі рыхтаваўся да набажэнства. Каб жа толькі забралі! Яшчэ выставілі і на пасмешышча. Асабліва стараўся старшы наглядчык. Якіх толькі крыўдных слоў ні знаходзіў, каб публічна прынізіць. Як ні "смакаваў" усяго, а шарэнга – што? Авечкі, сапраўдныя авечкі... Рогат, кпіны.

***

Пасля ўсяго ні з кім не хацелася гаварыць. Зашыцца б у які куток, каб нікога не бачыць і нічога не чуць. Ды ўсё ж ёсць Бог на свеце, ёсць! Акурат калі ўвесь белы свет здаваўся нямілым, калі роспач апанавала зусім, паслаў Бог добрага чалавека. Неспадзявана падышоў святарбазылянец, украінец па нацыянальнасці. Шмат ён не гаварыў, бо ведаў, што ў такі момант не словамі можна суцешыць, а ўсяленнем упэўненасці, што не так усё і безвыходна, як падаецца.

--Павер мне, будзе ў нас Боская Служба! -- толькі і прамовіў. Настолькі рашуча гэта прагучала, што Я. Германовіч ужо не сумняваўся, што менавіта так, а не інакш, і мусіць быць. Праз колькі хвілін яны выйшлі з барака, прыхініліся да сцяны і, быццам два змоўшчыкі, нешта шапталі адзін аднаму. І чым больш доўжылася гэтае перашэптванне, тым святлей ставілася на душы ў Германовіча. І яму хацелася абняць гэтага новага сябра і аднадумца.

Думка, якая неадноўчы прыходзіла ў лагеры, цяпер набыла яшчэ большую канкрэтнасць. Страшныя не адны ахоўнікі, гэткія ж страшныя, часам і больш, усе бязбожнікі. У сваёй атупелай бязбожнасці яны бываюць горшымі за рымскіх цэзараў, якія мучылі людзей за веру. А браты па веры – свае людзі, яны разумеюць з паўслова.

***

Святар-украінец падказаў (з уласнага вопыту), як для службы здабыць віно. Спачатку Германовіч не паверыў, што атрымаецца. Хоць і з цяжкасцю, але дастаў сушанага вінаграду і, як параіў украінец, заліў яго вадой. Калі разынкі разбухлі, ваду зліў, а вінаград акуратна выціснуў у кубачак, працадзіў у бутэлечку. І праз колькі дзён – калі ласка, вінаграднае віно!

Канечне ж, не было свечак, не было келіха, а пра алтар думаць грэшна. Тым не менш на свята Непарочнага Зачацця Дзевы Марыі адбылося першае набажэнства. Месца выбралі ў бараку ля самай сцяны – на шчасце, нары не стаялі ўпрытык да яе. Усе, хто браў удзел, цесненькім кружком размясціліся вакол Германовіча. Канечне, іншыя вязні, якія знаходзіліся поруч, убачылі, што адбываецца. Але што ў бараку адбываецца Боская Служба – здагадацца не маглі. Таму і не было асаблівых насмешак.

Быццам душой выпрасталіся – адбылося ж духоўнае ачышчэнне! А яшчэ сімвалічна, што праходзіла яно якраз у першыя ўгодкі пасля арышту.

***

Арыштавалі айца Германовіча ў 1948 годзе ў Харбіне кітайскія камуністы і перадалі савецкім уладам. І не аднаго, а з Андрэем Цікотам і Тамашом Падзявам. Атэістам прыйшлася не па душы місіянерская дзейнасць людзей, аддадных Богу. Не па душы, бо рабілі яны не тое, на што скіроўвалася ўвага будаўнікоў новага жыцця. Маўляў, якая карысць ад таго, што дапамагаюць беспрытульным і бедным дзецям? Пра гэта будзе каму паклапаціцца, а вось рэлігійную заразу неабходна знішчаць як мога хутчэй. І знішчалі.

За кратамі апынуліся сотні святароў. Былі сярод іх беларусы, рускія, украінцы – усе, хто працаваў у Харбіне, а хрысціянская місія там існавала з 1928 года. Германовіч першы раз прыехаў у Кітай у 1932 годзе, калі выконваў абавязкі дырэктара гімназіі. Быў настаўнікам, спавядальнікам жаночых манастыроў. Калі да арышту ўсё заканчвалася звычайнымі пагрозамі, дык, апынуўшыся за кратамі, зразумеў: ім, людзям веруючым, будзе найбольш цяжка.

Адразу пачалася самая што ні ёсць атака. Яна вялася, як кажуць, з двух бакоў. Адзін з іх прадстаўляў сам начальнік турмы, другі бок – у асобе следчага Іванова. Абодва стараліся як маглі, бо мелі перад сабой канкрэтна пастаўленую задачу – дабіцца ад падсуднага адступніцтва ад веры. У якасці прыкладу называлі святароў, якія сталі атэістамі. Чаго варты гэты атэізм, Германовіч лёгка ўпэўніўся, калі з адным з іх адбылася свайго роду вочная стаўка. Чалавек той быў поўнасцю псіхалагічна зламаны. Пра такіх звычайна кажуць: не ў сабе. Ён і нагаварыў на ўсіх. У выніку ў следства развязаліся рукі. У дачыненні да Германовіча і яго таварышаў па веры з'явіліся абвінавачванні, якія і былі патрэбны. Інкрымінавалася арганізацыя ваенна-тэрарыстычнага гуртка, супрацоўніцтва з замежнай буржуазіяй, шпіёнства на карысць Ватыкана і, як само сабой зразумелае, -- агітацыя супраць Савецкага Саюза.

Так пачалося блуканне па пакутах. Далёка-далёка ззаду засталася любая сэрцу Беларусь, дзе і з людзьмі, і з Богам ён імкнуўся гутарыць толькі пабеларуску. Сказаць, што гэта заўсёды лёгка давалася, -- пакрывіць душой. Надараліся моманты, калі не знаходзіў разумення. Польскім уладам не падабалася, калі звяртаўся да вернікаў на роднай мове. А яшчэ арганізоўваў беларускія школкі для дзяцей. Па гэтай прычыне часта пераязджаў з месца на месца.

***

Беларускае зерне ў яго душы было пасеяна, калі вучыўся ў Ашмянскай гарадской школе, у якой выкладанне вялося і па-руску, і па-беларуску. А дружныя ўсходы тое зерне дало, калі сам узяўся за пяро. Тады Германовіч працаваў пробашчам ў Вялікай Лепеніцы. Пачаў з газетных карэспандэнцый, а затым перайшоў на вершы, вершаваныя гутаркі. Выступаў пад рознымі псеўданімамі -- Лявон Ветрагон, Хлопчык з-пад Гародні. Пакуль не выбраў пастаяннае – Вінцук Адважны. Упэўненасці надало знаёмства з Максімам Гарэцкім, творы якога вельмі любіў. Той параіў маладому аўтару працягваць пісаць. Назаўсёды запомнілася Германовічу: "Ксёндз, ты мусіш пісаць! Грэх, калі не будзеш!"

Пазней ў 1936 годзе, пасля першага вяртання з Харбіна, у Вільні кіраваў беларускім інтэрнатам, куды запрашаў Максіма Танка, Міхася Забэйду-Суміцкага, Антона Луцкевіча, Янку Шутовіча...

У страшным сне не мог прысніць, што наперадзе чакае падобнае. Хіба магчыма, каб чалавека каралі за веру ў Бога! У 1939 годзе давялося сядзець ў савецкай турме ў Львове разам з ксяндзом, Фабіянам Абрантовічам. На следстве, каб дабіцца ад Абрантовіча патрэбных паказанняў, яму заганялі пад пазногці іголкі, праз рот залівалі ваду ў лёгкія. Чалавек пераæжыў нечуваныя пакуты, ды ад Веры не адрокся.

Быццам кволенькі агеньчык, які сіліцца выстаяць на сіберным ветры, усё ж недзе на сподзе душы цяпліла вера, што, магчыма, неяк і ўдасца выжыць. З ім жа Бог, і ён з Богам! Хіба гэтага мала?!

Але не толькі трэба выжыць, выстаяць, а калі ўдасца, то пра ўсё расказаць праўду. Айцец Германовіч адкладваў у памяці лагерныя эпізоды, каб пасля, на волі, запісаць іх на паперы.

***

На свабоду ён выйшаў ў 1955 годзе. Пажыў крыху ў Варшаве, а ў лістападзе 1959-га выехаў у Італію, у Рым. Пазней, у Англіі, рэдагаваў часопіс "Божым шляхам".

Памёр Язэп Германовіч 26 снежня 1978 года ў Англіі.

Ад задумы расказаць пра перажытае не адмовіўся. З'явілася дакументальна-мастацкая кніга "Кітай-Сібір-Масква", першае выданне якой пабачыла свет у 1962 годзе ў Мюнхене. Як частка той гулагаўскай літаратуры, уклад у якую ўнеслі беларускія пісьменнікі Барыс Мікуліч, Ядвіга Бяганская, Алесь Звонак, Станіслаў Шушкевіч, Сяргей Грахоўскі, Павел Пруднікаў... Іншыя ж творы Я. Германовіча сабраны ў аднатомніку "Байкі і іншыя вершы", выдадзеным у Лондане ў 1973 годзе пад ягоным псеўданімам – Вінцук Адважны.

НЕ УМЕР В ПЕЛЕНКАХ...

СОЛДАТСКИЙ СЛОВАРЬ

Подъем *– танец белых лебедей.*
Зарядка *– казнь на рассвете.*
Кросс *– никто не хотел умирать.*
После кросса *– живые и мертвые.*
Каптерка *– остров сокровищ.*
Казарма *– пристанище непокоренных.*
КПП *– с него начинается Родина.*
Подвиг разведчика *– поход за водкой.*
Сон на посту *– тревожное счастье.*
Тревога *– крик в ночи.*
Повар *– и жить хорошо, и жизнь хороша.*
Отбой *– я люблю тебя, жизнь.*
Дембель *– свет далекой звезды.*

СОЛДАТСКИЙ КАЛЕНДАРЬ

Масло съел *– день прошел.*
Два яйца съел *– неделя.*

ГЛАВА 1

Армия – единственное место на земле, где молодой мечтает стать дедом.

Служба – Самым Лучшим Уроком Жизни Была Армия.

Армия – сон, не дай бог ему присниться снова.

Будь проклят тот от века и от века, кто армией решил исправить человека.

И разве забудешь
Как был ты когда-то
Ни чертом, ни богом,
А просто солдатом.

Оценки службы в армии впечатляюще крайни. Они и становятся фольклором, кочующим по записным книжкам.

Служба в армии приходится на очень непростой период жизни молодого человека. Для каждого рожденного мир является вместе с ним и существует как бы для него: и родительская опека, и поддержка близких – фундамент этого мира. Нет опыта иного, и хотя жадные глаза тянутся к иным, далеким горизонтам, покинутое гнездо еще долго будет оставаться тонкой "пуповиной", связывающей молодую душу с армейской повседневностью.

Первое, что требует армия, -- забыть о своих привычках. Второе, -- прошлый опыт выбрасывается на свалку памяти. Новые обстоятельства диктуют выявление новых качеств. Итак, "пуповина" лопается, солдат остается один на один с жесткими установками, так или иначе затушевывающими личность.

Вот что пишет в своем первом письме девушке призывник, доставленный к месту службы: "... Доехал нормально, в смысле жив, здоров. Тело мое в Гродно, а душа в Минске, настроение отсутствует. Когда далеко от дома, одни только мысли: как там, что там? Что происходит здесь, меня вовсе не интересует. Думаю только о доме, о маме с папой, ну и, конечно, о тебе."

Вероятно, этот юноша за восемнадцать лет не выезжал дальше пригорода, но дело вовсе не в расстоянии как таковом, а в ощущении потерянности, оторванности от всего близкого.

Призывник! Короткий экскурс в сферу твоих возможных переживаний имеет конкретную цель: ты должен больше знать о себе, ты можешь научиться анализировать свои чувства и самостоятельно контролировать их, входя в границы простых понятий: жизнь штука длинная, не умер в пеленках, не умру и в портянках.

ГЛАВА 2

Присягу ты запомнишь на всю жизнь, потому что принародно давать клятву на верность тебе предоставится только один раз. Поэтому лучше всего пригласить на это торжество родных и близких, своих товарищей и свою девушку.

С этого дня, прочитав слова клятвы, ты берешь под свою защиту отца и мать, сестер и братьев, свой отчий дом и свою родную землю.

Главное, чтобы в череде будней не стерся священный смысл сказанного: "...свято выполнять Конституцию, Законы и воинские уставы".

Советы молодому солдату на каждый день.

1. Будь исполнительным! Быстрота и точность выполнения приказа – залог твоего положительного "сальдо".

2. Не анализируй командира, старайся брать от него лучшее, не обсуждай распоряжений. Наука подчиняться – наука не только быстрых ног, но и быстрого ума. Пока один раздумывает, проворный ум несколько раз исполняет.

Все конфликтные ситуации – в неприятии порядков, которые ты должен усвоить без всяких оговорок.

3. Делай все весело, с улыбкой. Твое хорошее настроение влияет на товарищей и может сделать тебя неформальным лидером.

ГЛАВА 3

Призывник призывнику рознь. Кто был лишен родительской опеки, кто до восемнадцати успел пройти иные жизненные университеты – хорошо адаптируется, напорист, агрессивен, умеет постоять за себя. Конфликт в казарме этих ребят с "домашними" предопределен, хотя и может развиваться в совсем неожиданных вариантах землячества, группировок по интересам и пристрастиям. Из этих ребят, как правило, формируется младший командирский состав, входящий в приближенное окружение прапорщика: с их помощью он наводит порядок в казарме и поддерживает дисциплину.

Дедовщина присутствует во всех армиях мира, и все они по-своему страдают от этой болезни.

Основная причина, порождающая дедовщину, - - это уступки командного состава армии низовым структурам. Кадровые военные делегируют переменному составу часть своей власти и льгот в обмен на более "свободную жизнь" (за небольшой оклад выкладывать себя без остатка могут немногие).

Отданная вниз "власть" узаконивает борьбу за лидерство и связанные с ним льготы солдат срочной службы. Более того, такая система – богатая почва для ростков древнего инстинкта, где властвуют механизмы отбора по принципу: "сильный – слабый".

В таких условиях "слабых" используют не только для создания минимального казарменного комфорта, но и как материал для самоутверждения.

Наибольших успехов в борьбе с этим пороком добилась американская армия. Там сержант – явление "кадровое", он 24 часа в сутки в казарме. (Система подмен – одну и ту же должность занимают несколько человек.) Олицетворяя собой государственный взгляд на порядок, он лицо – денежно заинтересованное. Система штрафов формирует его бюджет в весьма существенных пределах.

Кроме того, американский сержант умеет выполнить и выполняет то, что сам требует от подчиненных, с блеском. Он не только представляет власть, он ведет за собой слабых, необученных и прямо заинтересован в их выучке.

Но даже несмотря на все вышеперечисленное, проблемы неформального лидерства в воинских коллективах наемных армий есть. И если изжить такие проявления до конца пока невозможно, то, по крайней мере, контроль и управление ими не исключаются.

Что же происходит в казарме на территории Беларуси? Молва повествует о непрекращающихся случаях унижений молодежи. Дедовщина со временем видоизменилась и приобрела новый характер – завуалированный. Страшная тень дисбата делает новоиспеченных лидеров изобретательными.

Возьмем худший вариант и нарисуем картину без прикрас. Чтобы бороться со злом, надо знать его лицо.

За время службы солдат "делает карьеру", которая давно расписана по всем "ступеням лестницы", по категориям.

Основной признак категории – количество отпущенного сна. Кроме отдыха, после суточного наряда надо убрать помещение, территорию, выполнить хозработы.

Категория первая: "Запах" (или "Дух")

"Если ты без сна опух, значит, ты всего лишь дух".

(Выдержки взяты из записной книжки солдата.)

"Почему "запах"?" – спросите вы, и вам ответят: "Ты первый день в казарме, тебя никто не слышит. От тебя может исходить только запах и дыхание (дух)."

Категория вторая: "Если ты поспишь чуток, значит, ты уже свисток".

Категория третья: "Черпак" (спишь кое-как).

Категория четвертая: "Если ты поспал в обед, значит, ты, конечно, "дед".

"Дембель" может спать целый день (ночью у него дела поинтереснее).

ГЛАВА 4

Замкнутый круг: казарма – столовая – КПП – кухня – пост – казарма – изо дня в день выкрашивает горизонт в серые тона, и понятие "долг" не в состоянии наполнить службу содержанием значимости. Выбор способов отвлечения весьма ограничен, нет занятий по интересам, слабо организован спорт. В таких "камерных" условиях расцветают другие виды отвлечения – занятия "потешные", которым не нужен спортзал, специальная одежда и обувь и которые могут носить формы уставного армейского воспитания, а иногда привнесены из "зоны".

Сержант молодому солдату: "Рядовой Иванов, ко мне". (Должен подойти строевым шагом с отданием чести.)

"Срочно сигарету. Две минуты. Время пошло" (смотрит на часы). Если солдат не приносит или не укладывается во времени – следует наказание.

Одно из наказаний – "сушить крокодила". Упершись руками и ногами в спинки кровати, ты должен висеть над ней, не опускаясь, иначе получишь удары по животу.

"Заряжать лося" – удары кулаком в грудь, а чтобы не оставалось синяков, наказуемый обязан скрестить руки на груди.

Все это происходит, когда кадровые командиры покидают казарму. Сразу же после этого возле нее выставляется "оцепление" из молодых, обязанное предупреждать о непланованном появлении начальства. В это время начинается "иллюзион", потешное действо, сродни цирковому представлению. Дед, если ему пришла на то охота, кричит на всю казарму:

--Духи! Мухи!

Молодежь должна забраться на тумбочки и табуретки и жужжать, изображая руками полет насекомых. Новая команда:

--Дихлофос!

"Мухи" падают замертво на пол, лежат без движения, пока не последует команда "отбой химической атаке".

Каждый ли способен выносить такие унижения? Тех, кто "накачан", имеет решительный вид и не боится дедов, обычно оставляют в покое, зачисляя по тем или иным признакам в "друзья". Слабые духом предпочитают подчиняться, и иногда это физически развитые, но неуверенные в себе хлопцы. Такие ребята становятся "вечными уборщиками", ни на что не претендуют и не пытаются "компенсировать" собственное унижение. На таких командирам следует обращать особое внимание, они чаще всего подвержены трагическому восприятию действительности, нередко решаются на крайности: сводят счеты с жизнью.

Скрытые пружины вечного отбора, древние как сама жизнь, обнажены в армии как нигде. Ведь не для одной только потехи один человек унижает другого: здесь налицо демонстрация превосходства, силы, а интеллект, ставший мерилом лидерства в человечестве, отступает, прячется в тень.

Наша основная цель – убедить призывника в том, что в конечном счете последнее слово всегда остается не за слепой силой, а за разумом, и без желания молодого солдата изменить ситуацию к лучшему, стать активным сторонником исключения дедовщины все усилия армейских командиров, общественных организаций могут оказаться малоэффективными.

Призывник, помни, ты - - человек, а не орудие в руках людей, неумело или неосознанно, неправильно использующих армейскую власть.

Помни: преимущество в физической силе, превосходство большинства в казарме не способно изменить твой ум, твою волю – за твоими личными качествами всегда последнее слово.

По вопросу защиты твоих прав ты можешь обратиться в Белорусский Хельсинкский Комитет: ул. Варвашени, 20, 4 эт., тел. 268-73-23, 268-73-26. Председатель – Протько Татьяна Сергеевна. Военный отдел: Соколов Александр Иванович, тел. 268-13-70. Полная анонимность гарантируется.

МАТЕРИАЛ ПОДГОТОВЛЕН НА ОСНОВЕ "ПАМЯТКИ ПРИЗЫВНИКУ И СОЛДАТУ", КОТОРАЯ СТАРАНИЯМИ ВОЕННОГО ОТДЕЛА БЕЛОРУССКОГО ХЕЛЬСИНКСКОГО КОМИТЕТА СКОРО УВИДИТ СВЕТ В ВИДЕ ОТДЕЛЬНОЙ БРОШЮРЫ.

Валерый ЧАРНЯЎСКІ

З ЗОНЫ Ў ЗОНУ

СЁННЯ Ў ПЭЎНЫХ КОЛАХ УЛАДЫ "ПРЫЯРЫТЭТНАЙ" СТАЛА ПРОСТАЯ, ЯК АМЁБА, ДУМКА: НАША КВОЛАЯ ЭКАНОМІКА МНОГАГА ДАЦЬ ЧАРНОБЫЛЬЦАМ НЕ Ў СТАНЕ. РАСШЫФРОЎВАЦЬ ГЭТЫ ПАДЫХОД ТРЭБА ТАК: ГРАМАДЗЯНЕ, ПАЦЯРПЕЎШЫЯ АД КАТАСТРОФЫ, НА АСАБЛІВУЮ ДАПАМОГУ З БОКУ ДЗЯРЖАВЫ НЕ РАЗЛІЧВАЙЦЕ.

Успамінаецца жарт-здзек, пушчаны адным з палітыкаўняўдачнікаў: Беларусь, маўляў, -- краіна пенсіянераў і скаржнікаў. Калі ж глянуць аб'ектыўна і непрадузята, то ці ёсць падставы здзекавацца з таго, што за дзесяцігоддзі жыцця ва ўмовах "сацыялістычнай дэмакратыі" людзей прывучылі цярпець і скардзіцца, скардзіцца і зноў цярпець? Засталося толькі пасмяяцца над тым, што і ў чарнобыльцаў, пацярпеўшых ад "мірнага атама", напісанне скаргаў -- таксама распаўсюджаны занятак.

Што ж, давайце пасмяёмся разам. Напрыклад, над наступнымі радкамі: "Захворваемасць дзяцей у Першаях па ўзроўню не ўступае захворванням дзяцей у Гомельскай вобласці. Асабліва жудасна выглядае захворваемасць дзяцей ад 6 да 15 гадоў, сярод якіх няма ніводнага абсалютна здаровага дзіцяці.

За мінулыя гады ўзровень смяротнасці значна перавышае ўзровень нараджальнасці. Так, напрыклад, за 1995 год па сельсавету зарэгістравана 33 смерці, а нарадзілася ўсяго толькі 12 немаўлят. Ужо за першы квартал бягучага года памерла 17 чалавек, а нарадзілася ўсяго двое дзяцей".

Каго тычацца гэтыя радкі? Жорстка радыяцыйнага Брагінскага ці, скажам, Нараўлянскага раёна? Ды не, адносна "чыстага" Валожынскага. Гэта выбаршчыкі Пяршайскага сельсавета звярнуліся з адкрытым пісьмом да свайго дэпутата ў Вярхоўным Савеце Г. Кашкана (былога спецыяліста былога Дзяржкамчарнобыля, а цяпер - адказнага супрацоўніка Адміністрацыі Прэзідэнта). І звярнуліся менавіта "з просьбай пачуць іх крык аб дапамозе". Толькі ці па адрасу?

Праблема ў пяршайцаў тая ж, што ў большасці нашых суграмадзян, няшчасны лёс якіх - жыць на забруджанай зямлі. Цэнтр сельсавета і іншыя вёскі раней знаходзіліся ў зоне з узроўнем забруджвання 5-10 кі/кв.км. Пасля ж вядомага рашэння, прынятага ў лютым Кабінетам Міністраў, гэтыя землі раптам аказаліся ўжо ў больш "чыстай" зоне - з узроўнем 1-5 кюры. Падобныя "перакідкі", зробленыя росчыркам пяра, могуць узрушыць каго хочаш.

Жыхары Першаёў, усведамляючы, што ім няма больш на каго спадзявацца, як толькі на дзяржаву, з горычу пытаюць: "Няўжо мы і нашы дзеці не вартыя лепшай долі, не маем нармальнага будучага?"

Цікава, што б яны сказалі-напісалі, калі б ведалі: яшчэ загадзя, у верасні мінулага года выканаўчыя ўлады прынялі спецыяльнае рашэнне, якім меры сацыяльнай абароны ў зоне 1-5 кюры назогул "здымаліся", а потым адбыўся і славуты перавод тэрыторый з зоны ў зону? Як ацанілі б гэтыя меры па "абароне" людзей ад радыяцыі?

[redacted]

Сацыяльна-палітычныя камбінацыі на постчарнобыльскім полі -- гэта ілюстрацыя на тэму падзабытай ужо прымаўкі: у воку суседа бачу парушынку, а ў сваім не заўважаю і бервяна. Па прывычцы колем тых жа палітыкаў Захаду прыкладамі іх дзеянняў па прынцыпу двайнога стандарту, двайной маралі, а што робім самі?

Унутры краіны праштурхоўваем тэзіс аб тым, што на забруджаных тэрыторыях наступіў, ці бачыце, "аднаўленчы перыяд", а таму можна і трэба скарачаць выдаткі на сацыяльную абарону пацярпеўшых. Затое ўрадам замежных краін, сусветнай грамадскасці прапануем справядлівыя доказы аб велізарных стратах Беларусі ў выніку ядзернай катастрофы. Апошнія, заўважу, у многім адгукаюцца.

Зноў вернемся ў Першаі, у канец 1994 года. Аўтар быў сведкай тых слоў, якія гаварыў пры адкрыцці ў вёсцы цэнтра сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі айцец Дзмітрый, свяшчэннік з Валожына: "Гэты цэнтр вельмі патрэбны ў Першаях, асабліва калі ўлічыць тое, што людзі тут жывуць на забруджанай зямлі."

Установа сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі, прызваная дапамагаць мясцовым сялянам у іх нялёгкім жыцці, была ўзведзена пры ўдзеле і фінансавай дапамозе ЮНЕСКО, іншых міжнародных арганізацый. Многае было сказана, многае планавалася ў той лістападаўскі дзень, калі на адкрыццё цэнтра прыехалі намеснік Генеральнага дырэктара ЮНЕСКО А. Бадран, тагачасны прадстаўнік ААН у Беларусі М. Каханэ, беларускія міністры, іншыя афіцыйныя асобы. Ніхто, аднак, не мог прадбачыць сённяшняй дзіўнай сітуацыі, калі ўсіх гэтых паважаных і разумных людзей можна "абвінавачваць" у тым, што яны дзейнічалі, сказаць мякка, даволі неразумна. Сапраўды, дадумацца ўзвесці чарнобыльскі цэнтр у практычна "чыстай" зоне.

Аднак - досыць! І рэабілітацыйны цэнтр "пасаджаны" правільна, і падставы для гэтай акцыі разлічаны дакладна, і жыццё ў Першаях па-ранейшаму "радыяцыйнае" - з усімі яго кюры і павышанай дозай унутранага апраменьвання чалавечага арганізму ад забруджаных харчовых прадуктаў.

І яно, жыццё, у зоне такім і застаецца, незалежна ад таго, што стратэгам ва ўладзе вельмі хочацца, хоць бы на паперы, яго прыхарошыць. Трэба ж мець нейкія падставы, каб эканоміць і яшчэ раз эканоміць. На безабаронных чарнобыльцах, зразумела.

Вось ім гэтая "эканомія" сапраўды вылазіць бокам. Чарговая скарга - маці двух дзяцей са Столінскага раёна звоніць, пералічваючы свае праблемы: "Узровень забруджвання ў нас да пяці кюры. Раней я магла пайсці да ўрача і выпісаць дзецям вітаміны і лякарствы. Гэта рабілася па Закону сацыяльнай абароны пацярпеўшых ад Чарнобыля бясплатна. Цяпер мне адказваюць: вам не належыць. Як нам жыць, калі на дзяцей атрымліваю ад дзяржавы дапамогу ў памеры ўсяго 180 тысяч, ды і сама магу зарабіць не намнога больш?" Ці стане лягчэй гэтай маці, калі ёй растлумачыць, што Вярхоўны Савет у вышэйпамянёным законе анічагусенькі не мяняў, а вось выканаўчая ўлада "абсякае" яго як ёй хочацца?

Як растлумачыць жыхарам сумна вядомай вёскі Альманы з таго ж Столінскага раёна, чаму закон не можа абараніць іх здароўе, а ў выніку, магчыма, і жыццё? Шчыльнасць забруджання цэзіем тут зноў жа "ўвогуле бяспечная" - за 5 кі/кв. км. Аднак прыродныя ўмовы такія, што харч атрымліваецца з радыёнуклідамі. Радыёактыўнасць, напрыклад, малака амаль у 50 разоў вышэй за норму. У выніку кожны "сярэднестатыстычны" селянін атрымлівае сярэднюю ўнутраную дозавую нагрузку, роўную тром мілізівертам у год - яна ў тры разы перавышае дозавую мяжу. Колькі ж тут пражыве чалавек, калі яго пазбавіць радыяцыйнай і сацыяльнай абароны? Але ж менавіта гэта сёння і адбываецца!

Прыкрываецца ж усё здзеклівым вызначэннем наяўнасці "аднаўленчага перыяду", на якім будуецца "новая" антыгуманная "Канцэпцыя ахоўных мераў..."

[redacted]

Свядомыя людзі сцвярджаюць: у цяперашняга міністра аховы здароўя І. Драбышэўскай справы ладзіліся лепш, калі яна яшчэ не ўзначальвала галіну, а была дэпутатам парламента. Сёння ў рабоце міністэрства хапае пралікаў, прэзідэнт з гэтай нагоды рабіў яго кіраўніку афіцыйныя папярэджанні. Іншы ж раз, дададзім ад сябе, міністра можна было б ушчуваць і не так строга, бо маюцца, як кажуць, на рахунку і такія ўчынкі, за якія многае можна дараваць.

У час першай паздкі Лукашэнкі ў чарнобыльскую зону афіцыйныя выданні пісалі: "Прэзідэнцкая пазіцыя прадугледжвае больш ліберальныя адносіны да перасяленцаў. Людзі павінны вырашаць самі -- пераязджаць ім ці заставацца на ранейшым месцы, самастойна вырашаць свой лёс". Рабіліся спасылкі і на тое, што ўсім неабходна памятаць папярэджанне Мінахова здароўя: тым, каму раджаць і гадаваць дзяцей, небяспечна заставацца на тэрыторыях са шчыльнасцю забруджвання звыш 15 кюры на квадратны кіламетр. Таму вучоныя прадстаўляць насельніцтву ўсе даныя аб магчымых выніках пражывання ў "брудных" раёнах.

Вызначыўся тады і першы адрас новага ліберальнага падыходу: адселеная раней вёска Савічы Брагінскага раёна, між іншым, за 30 кіламетраў ад Чарнобыльскай станцыі, у зоне адчужэння, з моцным радыяцыйным фонам. Падкрэслім яшчэ, што ў ліку тых самасёлаў налічваецца і дзевяць дзяцей.

Што было неабходна самасёлам? "Патрэбна баня, трактар і камбайн для сельгасработ. А яшчэ - каб доктар прыязджаў хоць два разы на тыдзень, іншыя спецыялісты. Ды каб аўталаўка..."

"Вас больш не будуць чапаць, не з'явіцца праблем з прапіскай. Рукі вам ніхто выкручваць не будзе. Вырашылі жыць - жывіце! Дапамогу акажам," - быў адказ. Упаўне папулярна, з павагай да жыхароў і іх правоў. Што яшчэ сказаць?

Аднак міністр Інэса Драбышэўская знайшла: "Жанчыны, апамятайцеся, у вас жа дзеці!" Яна запратэставала як спецыяліст, урач супраць такога лёгкага падыходу людзей не толькі да свайго здароўя, але і да лёсу тых малых, якім яшчэ жыць ды жыць.

Можна шмат гаварыць аб правах чалавека ўвогуле. Але не трэба забываць пра самае галоўнае - яго права на здаровае жыццё. Што могуць сказаць сёння навукоўцы кожнаму чарнобыльцу аб стане яго здароўя: колькі арганізм паспеў ужо праглынуць радыёнуклідаў, ці вытрымае далей радыяцыйны ціск, ці выжыве чалавек у такіх умовах наогул? Нічога! Гэтая праблема чарнобыльскай праграмы наогул яшчэ не распрацоўвалася - праз дзесяць гадоў пасля катастрофы!

Відавочна, з сённяшняй нашай эканомікай дзяржава ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі проста не ў стане ўзвесці ў сотнях чарнобыльскіх вёсак і пасёлкаў усю бытавую інфраструктуру, стварыць неабходныя рабочыя месцы. Забяспечыць іх жыхароў чыстымі прадуктамі харчавання, а жывёлу адпаведнымі кармамі -- і то "невырашальная" праблема.

З чым, акрамя гучных дэкларацый, застаюцца чарнобыльцы? З квёлай надзеяй на лепшую будучыню і папяровымі правамі? Мы ж бачым, з якой лёгкасцю "адпалавіньваецца" і тое нямногае, на што людзі маюць права па чарнобыльскім заканадаўстве.

[redacted]

Непапулярныя сацыяльна-эканамічныя рашэнні яшчэ ніколі не прымаліся без нейкага штучнага падмацавання, "ідэалагічнай" базы. Базай для наступу на чарнобыльскае заканадаўства і льготы чарнобыльцаў паслужыла тая самая "новая" "Канцэпцыя ахоўных мераў у аднаўленчы перыяд..." Па сутнасці, гэта не што іншае, як своеасаблівы заказ яшчэ былога ўрада, з гатоўнасцю выкананы групай вучоных. Гэты "сыры" дакумент дае магчымасць уладам дзейнічаць так, каб зняць з сябе адказнасць за лёс мільёнаў людзей.

Зрэшты, не толькі ва ўрадзе маюцца майстры гуляць на шахматных клетках "чарнобыльскага поля". Вярхоўны Савет у адказ зрабіў і свой ход - накіраваў запыт у Акадэмію навук і пракуратуру Рэспублікі Беларусь. Чаму так сур'ёзна?

Можна доўга расказваць, як праштурхоўвалася ідэя, але, думаецца, дастаткова будзе і адной характэрнай дэталі, якую шырокай грамадскасці, зразумела, ніхто паведаміць не захацеў. "Новую" канцэпцыю Кабінет Міністраў адобрыў пастановай ад 30 лістапада 1995 года. Чарнобыльскую дзяржпраграму, распрацаваную на аснове гэтай канцэпцыі, урад прыняў... на два з палавінай месяцы раней - 12 верасня!

Скандал, дый годзе. Вось і чакаюць у парламенце: калі ў выніку пацвердзіцца, што тут мелі месца парушэнні законных правілаў і працэдур, то застаецца толькі ставіць пытанне аб адказнасці афіцыйных асоб, якія "нахімічылі".

У Акадэміі навук гэтая канцэпцыя так і не была толкам разгледжана і адобрана. Яна па-сутнасці -- пакуль толькі стос аддрукаваных папер. Але ж якія лёсасносныя для масы людзей рашэнні прымаюцца ўжо на "базе", якая сама ўзведзена на пяску! На мове сённяшніх лозунгаў усё гэта называецца, відаць, "прафесіяналізмам і дзяржаўным падыходам".

Увесь ход падзей падводзіць да пытання: ці была ў Беларусі калі-небудзь ўзважаная чарнобыльская палітыка? Ці маецца яна сёння? Усё ж такі яна - прыярытэт для нацыі, паколькі мы жывём не дзе-небудзь, а ў рэспубліцы, аб'яўленай калісьці нашым парламентам зонай экалагічнага бедства. А якія прыярытэты ва ўрада? Яго кіраўнік ужо адкрыта заяўляе: праблема Чарнобыля, маўляў, перабольшана, трэба... скарачаць неапраўданыя расходы па чарнобыльскай лініі і спыніць выплаты кампенсацый людзям, што жывуць у зоне з радыяцыйным забруджваннем ад 1 да 5 кюры.

Што і зроблена. З'явіўся і новы пералік тэрыторый і населеных пунктаў, што адносяцца да зон радыяцыйнага забруджвання, -- сотні тысяч чалавек адразу былі пазбаўлены ільгот. Праўда, прэзідэнт адрэагаваў даволі хутка, бо зразумеў, якая міна закладваецца пад яго ўнутрыдзяржаўны курс. Таму фактычна адмяніў рашэнне ўрада, даручыўшы яму падрыхтаваць пастанову, каб школьнікі ў забруджанай зоне па-ранейшаму маглі бясплатна харчавацца і дзеці аздараўляліся за кошт дзяржавы.

Такім чынам, закон у нейкай частцы велікадушна будзе адноўлены. Чаму тады яго рушылі? Таму, што ўсе мы жывем у зоне парушаных законаў.

НА ПРАВО НАДЕЙСЯ, НО САМ НЕ ПЛОШАЙ

ПОУЧИТЕЛЬНЫЕ ИСТОРИИ СОБИРАЕТ ЖУРНАЛИСТ

ГАРАНТИЙНЫЙ РЕМОНТ

Рассказ меломана

Музыкальный центр покупал я себе в магазине без всякого страха и сомнения. Была середина 1996 года, и уже вышли в свет в ранге закона положения о защите прав потребителя. К музыкальному центру прилагалось бесплатное гарантийное обслуживание на целый год. Два месяца я, надежно подпертый с одной стороны мягким диваном, а с другой стороны законом о защите своих прав и годовым гарантийным обслуживанием, безмятежно наслаждался чистым живым звуком японской фирмы "Панасоник". Но вдруг однажды заметил, что одна колонка звучит иначе, чем другая. Тщательно поэкспериментировав с магнитофоном, я убедился, что одна из колонок, хотя и незначительно, но теряет в звучании, играет несколько глуховато. Это меня не сильно расстроило, ровно настолько, насколько мне не хотелось тянуть всю аппаратуру в гарантийную мастерскую, которая находилась отнюдь не в соседнем подъезде. Я отыскал данный мне при покупке музыкального центра гарантийный талон. В талоне было написано, что обладателю сего в случае поломок гарантируется бесплатный ремонт в течение всего года со дня покупки при условии соблюдения покупателем всех правил пользования аппаратурой, изложенных в паспорте. Ни одно из этих правил я не нарушил и поэтому принес свою недавнюю покупку в гарантийную мастерскую.

Мастерской оказалась обычная квартира на первом этаже пятиэтажного панельного дома. В этой квартире располагалась одна из многих торговых фирм, осуществлявшая попутно и гарантийный ремонт. Вся она от пола до потолка была завалена стоящей в коробках и без них радио и видеотехникой. После того, как я изложил суть неисправности, специалист по ремонту принялся прослушивать мой магнитофон. Но в квартире везде все пело и играло. Работали телевизоры, магнитофоны, то и дело раздавались мат и трели телефонных аппаратов. В этом хаосе звуков услышать разницу в работе моих колонок практически было невозможно. Специалист по ремонту, судя по всему, вовсе и не хотел услышать эту разницу. Во время прослушивания он не попытался закрыть дверь в другую комнату. Пощелкав кнопками и покрутив несколько ручек, он со скучающим видом заявил, что не слышит и не видит никакого отклонения в работе аппаратуры.

Соседнюю шумную комнату закрыть было нельзя, потому что дверь была приперта несколькими огромными коробками, но я не поленился переставить несколько телевизоров. И когда я освободил дверь и закрыл ее, сразу стало потише. Теперь невозможно было не заметить небольшую разницу в звучании двух колонок. И дядя, скучающий над моим магнитофоном, эту разницу заметил. Но заявил тут же, что звук в одной из колонок несколько хуже потому, что так записано на моей кассете. На мое предложение послушать его кассету он ответил, что кассет у него нет. А еще посоветовал сменить студию звукозаписи, где я купил кассету. Я заметил специалисту, что у меня дома тридцать кассет, записанных не то что в разных студиях звукозаписи, а даже в разных городах. Специалист по ремонту пропустил мое замечание мимо ушей и изрек: "Для того, чтобы ремонтировать аппарат, я должен видеть поломку."

